ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№1 (1000), СТУДЗЕНЬ, 2017
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка, эканоміка, культура

ISSN 0320-7544



# ЖЫВАЯ ПЛЫНЬ ДУХОЎНАСЦІ

INTERNATIONAL

# The Minsk Times

Socio-political Weekly

## Пра падзеі ў Беларусі і свеце

# Штотыднёвік, які чытаюць у арыгінале

Не спазніцеся аформіць падпіску
Індэксы: ведамасны — 637302, індывідуальны — 63730

# ЗМЕСТ





**10 Будаўнікі пацвердзілі рэпутацыю** Гэта падаецца неверагодным, але дарожнікі сапраўды здзейснілі немагчымае. За год з нечым яны праклалі звыш 40 кіламетраў камфортнай чатырохпалоснай дарогі, якая злучыла трасу Мінск — Гродна з так званай “алімпійкай” (аўтадарогай Брэст — Мінск — граніца Расіі). Гэта дало магчымасць замкнуць другое кальцо вакол сталіцы






**12 Пенсійная справа ў новым фармаце** З 1 студзеня пачалося паэтапнае павышэнне пенсійнага ўзросту, так што ўжо ў 2022 годзе жанчыны будуць выходзіць на пенсію ў 58 гадоў, а мужчыны — у 63 гады

**14 Вялікі патэнцыял “малога”**

**16 У сталіцы з’явяцца спадарожнікі** Якім будзе Мінск праз паўтара дзесяцігоддзя, беларускія архітэктары ведаюць дакладна. І дар яснабачання тут ні пры чым. Далягляды заўтрашняга дня сталіцы раскрывае Генеральны план развіцця да 2030 года

**20 Наваселле на вяселле** Жыллёвыя пазыкі пад нізкія працэнты

**28 Зразумець чужы боль** Тэрмін “паліятыўная дапамога” не вельмі даўно замацаваны заканадаўча, але ўжо трывала ўвайшоў у медыцынскую практыку

**30 Сябры збіраюцца разам**

**36 Дзве капейкі, альбо Тэст на чалавечнасць**

**42 Вялікі Шаўковы шлях** Беларус і таджык напісалі раман пра старажытныя Туркменістан і Кітай

**44 Яшчэ не ўсе таямніцы разгаданы** Пяць прычын паехаць у Слонім

**50 Каб умець танчыць, трэба больш чытаць** Гран-пры конкурсу XXIX Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску прысуджаны салісту Цэнтральнага ансамбля песні і танца арміі Кітая Юйчэну Яа






**Беларусь. Belarus**

Штомесячны часопіс

**№ 1 (1000), студзень, 2017**
Выдаецца з 1930 года.

**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 8.**
Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:**
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Рэдакцыя газеты “Советская Белоруссия”, ААТ “Белзнешэканамбанк”

**Рэдактар**
Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Дызайн і вёрстка:**
Вадзім Кандрашоў
Надзея Панкратава

**“Беларусь.Belarus”** выходзіць на беларускай, англійскай, іспанскай і польскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **“Беларусь. Belarus”** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

**Выдавец:**
Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “Рэдакцыя газеты “Советская Белоруссия”. Вул. Б. Хмяльніцкага, 10$^{а}$, 220013, Мінск.

Часопіс надрукаваны ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве “Выдавецтва “Беларускі Дом друку”. Паліграфічная ліцэнзія №02330/106 ад 30.04.2004. Пр-т Незалежнасці, 79, г. Мінск, Беларусь, 220013

Падпісана ў друк 24.01.17 г.
Выпуск у свет 31.01.17 г.

Афсетны друк. Папера крэйдаваная. Фармат 60x90 1/8. Друкаваных аркушаў 7. Гарнітура Міньён.

**Заказ № 238**
**Агульны тыраж** — 2324 экз.
(на беларускай мове — 182)

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Кісялёва, 11, г. Мінск, Беларусь, 220029.
Тэл.: +375 (17) 290-62-24,
+375 (17) 290-66-45.
Тэл./факс: +375 (17) 290-68-31.

**E-mail:** belmag@sb.by
**Падпісны індэкс** — 74820.
**Цана дамоўная.**



© **“Беларусь. Belarus”**, 2017

# Усведамленне будучыні



ВАДЗІМ КАНДРАШОЎ

Што з'яўляецца больш значным — культура ці духоўнасць? Напэўна, такое паняцце, як духоўнасць, усё ж пераважвае. Культура — гэта спадчына, якая блізка звязана з адукацыяй. А духоўнасць — стан душы чалавечай, багатай на шчырыя пачуцці любові, павагі, бескарыслівасці ў адносінах з блізкім. І шмат чаго яшчэ, што цяжка выказаць звычайнымі словамі. Куды часцей гэта можна толькі адчуць.

Пра высокія духоўныя якасці не забываюць у сучаснай беларускай дзяржаве. Больш за тое, іх высока цэняць у людзях, чые намеры былі актыўна накіраваныя на стварэнне. Нездарма кожны год у яго пачатку краіна ўшаноўвае лаўрэатаў прэміі "За духоўнае адраджэнне". Цырымонія з удзелам кіраўніка дзяржавы надае асаблівую значнасць падзеі, якая ўвасабляе гонар за нацыянальную самасвядомасць, за дасягненні, што праслаўляюць Беларусь, робяць яе вядомай у свеце, дапамагаюць захаваць памяць аб нашых каранях. **"Жывая плынь духоўнасці"** — публікацыя на гэтую тэму ў цяперашнім нумары часопіса.

Жыццё не стаіць на месцы, імкліва рухаецца наперад. Мяняюцца гарадскія і сельскія ландшафты. Якім будзе Мінск праз паўтара дзесяцігоддзя? Хто-хто, а беларускія архітэктары ведаюць дакладна. І дар яснабачання тут ні пры чым. Далягляды заўтрашняга дня сталіцы раскрывае Генеральны план развіцця да 2030 года. Надаць годную агранку сталіцы — такая задача пастаўлена перад архітэктарамі. Гэта азначае навесці горадабудаўнічы парадак. Ужо відавочна, што Мінск застанецца кампактным. Затое стануць развівацца гарады — спадарожнікі сталіцы... Зрэшты, усе падрабязнасці ў матэрыяле, які так і называецца **"У сталіцы з'явяцца спадарожнікі"**.

Што яшчэ нас чакае наперадзе? На малы бізнес ускладаюцца вялікія надзеі. У 2017 годзе за кошт з'яўлення і развіцця прыватных прадпрыемстваў, стварэння ў іх новых працоўных месцаў наша эканоміка павінна павялічыцца не менш як на 0,8 працэнта. Гэта, дарэчы, практычна палова ўсяго прагназуемага прыросту ВУП. А ў 2020 годзе ўзровень валавога ўнутранага прадукту, які фарміруецца такім бізнесам, павінен вырасці ўжо да двух з паловай працэнта. Ці пад сілу "малым" такія задачы? Ва Урадзе настроены аптымістычна. У гэтай сферы заняты кожны трэці жыхар краіны. І далей, трэба меркаваць, будзе больш. Зразумела, што разлічваць на рост малога і сярэдняга бізнесу без пэўнай падтрымкі было б недарэчна. Гэта як вырошчваць расліны на сухой глебе без падкормкі ўгнаеннямі. На якіх момантах абяцалі сканцэнтравацца ва Урадзе? Пра гэта вы даведаецеся з публікацыі **"Вялікі патэнцыял "малога"**.

А ў цэлым, наша краіна выглядае вельмі тэхналагічна. Яна, паміж іншым, безумоўны лідар у развіцці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у СНД. Гэта выснова штогадовай справаздачы "Вымярэнне інфармацыйнага грамадства" Міжнароднага саюза электрасувязі, які ацэньвае індэкс ІКТ у 175 краінах адразу па 11 паказчыках. Ад спецыфічных тэхналагічных крытэрыяў — да колькасці абанентаў мабільнай сувязі ці актыўных карыстальнікаў інтэрнэту. Цяпер у агульнасусветным рэйтынгу мы занялі 31-е месца. Але ж яшчэ ў 2008-м знаходзіліся на 84-й пазіцыі... Найбліжэйшы канкурэнт па СНД Расія сёння прыкметна адстае — у яе 43-ці радок.

Так, усё ці даволі многае пазнаецца ў параўнанні. І калі мы не адстаём, а нават наперадзе, то гэтым можна ганарыцца. Усведамленне такой будучыні падаецца вельмі спрыяльным і перспектыўным.

**ВІКТАР ХАРКОЎ**



# Навіна, якая зацікавіць шмат каго

**Беларусь уводзіць пяцідзённы бязвізавы рэжым для грамадзян 80 краін**

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 9 студзеня падпісаў указ №8 "Аб устанаўленні бязвізавага парадку ўезду і выезду замежных грамадзян". Дакументам устанаўліваецца бязвізавы парадак уезду ў Беларусь на тэрмін не больш за 5 сутак пры ўездзе праз пункт пропуску цераз Дзяржаўную граніцу Нацыянальны аэрапорт Мінск для грамадзян 80 дзяржаў.

Указ распаўсюджваецца на 39 краін Еўропы, уключаючы ўвесь Еўрасаюз, а таксама Бразілію, Інданезію, ЗША, Японію ды іншыя дзяржавы. У першую чаргу, гэта добранадзейныя ў міграцыйным плане краіны, стратэгічныя партнёры Беларусі, дзяржавы, якія ў аднабаковым парадку ўстанавілі бязвізавы рэжым у адносінах да беларускіх грамадзян. Новыя правілы ахопліваюць таксама такую катэгорыю, як неграмадзяне Латвіі, і асобы без грамадзянства Эстоніі.

Дакумент, перш за ўсё, накіраваны на актывізацыю падарожжаў бізнесменаў, турыстаў, прыватных асоб, якія маюць агульнаграмадзянскія пашпарты, і не будзе распаўсюджвацца на замежнікаў, якія ажыццяўляюць афіцыйныя паездкі: дыпламатычныя, службовыя, спецыяльныя ды іншыя прыраўнаваныя да іх пашпарты брацца пад увагу не будуць.

З падрабязнасцяў важна, што для ўезду ў бязвізавым рэжыме неабходна мець пры сабе дзеючы пашпарт або іншы дакумент, які яго замяняе, для выезду за мяжу, грашовыя сродкі (на кожны дзень знаходжання суму ў валюце ці беларускіх рублях, эквівалентную не менш як двум базавым велічыням), медыцынскі страхавы поліс на суму не меншую за 10 тысяч еўра, што дзейнічае ў Беларусі.

А вось для грамадзян В'етнама, Гаіці, Гамбіі, Гандураса, Індыі, Кітая, Лівана, Намібіі, Самоа абавязковым дадатковым патрабаваннем з'яўляецца наяўнасць у дакуменце для выезду за мяжу дзеючай шматразовай візы дзяржаў ЕС або Шэнгенскай зоны з адзнакай аб уездзе на іх тэрыторыю, а таксама авіябілетаў з пацверджаннем у іх вылету з Нацыянальнага аэрапорта Мінск на працягу 5 дзён з даты ўезду.

Варта ўлічыць, што парадак бязвізавага перамяшчэння, які ўстанаўліваецца, не распаўсюджваецца на асоб, што прыбываюць у Беларусь авіярэйсамі з Расіі, а таксама маюць намер ажыццявіць вылет у аэрапорты Расіі (гэтыя рэйсы з'яўляюцца ўнутранымі, пагранічны кантроль на іх не ажыццяўляецца).

Указ уступіць у сілу праз месяц пасля афіцыйнага апублікавання.

# На карысць узаемных інтарэсаў

**Злучаныя Штаты Амерыкі разлічваюць на ўмацаванне адносінаў з Беларуссю. Пра гэта гаворыцца ў заяве пасольства ЗША ў Беларусі з нагоды 25-годдзя ўсталявання дыпламатычных адносінаў паміж дзяржавамі.**

У пасольстве адзначылі, што з моманту ўсталявання ў 1991 годзе дыпламатычных адносінаў Злучаныя Штаты цвёрда падтрымлівалі незалежнасць і суверэнітэт Беларусі на шляху да большай дэмакратыі і дабрабыту.

"На працягу гэтых гадоў ЗША і Беларусь сумесна працавалі над умацаваннем еўрапейскай і сусветнай бяспекі. Мы віталі прынятае Беларуссю ў 1994 годзе гістарычнае рашэнне адмовіцца ад ядзернай зброі, якое было значным укладам у ядзернае раззбраенне", — гаворыцца ў заяве.

У дыппрадстаўніцтве дадалі, што за гэтыя гады тысячы беларусаў наведалі ЗША ў рамках адукацыйных і прафесійных праграм. У сваю чаргу амерыканскія эксперты, выкладчыкі і настаўнікі прыязджалі ў Беларусь для абмену ведамі з мясцовымі калегамі.

# 3D-ілюзія рэальна спадабалася

**Журналісты папулярнага выдання USA Today наведалі выставу CES 2017 у Лас-Вегасе, дзе былі прадстаўлены больш за 20 тысяч гаджэтаў з усяго свету, і склалі свой топ-10. Праект беларусаў Арцёма Ставенкі і Кірыла Чыкеюка Kino-Mo ўвайшоў у гэтую дзясятку.**

Распрацаваны беларусамі дэвайс дазваляе відэа і выявам здавацца завіслымі ў паветры, ствараючы незвычайную 3D-ілюзію. З гэтай распрацоўкай Ставенка і Чыкяюк перамаглі ў конкурсе кампаніі Virgin Media, заснаванай мільярдэрам Рычардам Брэнсанам. Крыху пазней дагавор аб інвестыцыях з кампаніяй беларускіх распрацоўшчыкаў падпісаў яшчэ адзін мільярдэр Марк Кьюбан.

# Словы пра мір, дабрыню і надзею

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заклікаў да адзінства паміж народамі і ўнутры царквы. Пра гэта кіраўнік дзяржавы заявіў, наведваючы ў свята Раства Хрыстовага Свята-Духаў кафедральны сабор Мінска.**

"Нам абсалютна не перашкаджае тое, што мы з брацкімі народамі — расіянамі, украінцамі, іншымі народамі і народнасцямі, якія пражываюць у нашых дзяржавах, у лоне Праваслаўя знаходзімся разам, — заявіў Прэзідэнт Беларусі. — А тое, што сёння наспела, і тое, што трэба вырашаць у царкве, у дзяржаве, я гэта гаварыў на Сінодзе. Гэта нічога агульнага не мае з тым, што мы павінны абавязкова парэзаць усё па жывым і раз'яднацца. Не трэба гэта рабіць. Трэба быць спакойнымі, вырашаць тыя задачы, якія ёсць, і крыху глядзець наперад. Не трэба глядзець вельмі далёка. У адваротным выпадку мы можам дапусціць памылкі. У наш няпросты час гэта недапушчальна".

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў свята Раства Хрыстовага людзі звяртаюцца да вечных аб'яднальных каштоўнасцяў. "Мы заўсёды гаворым пра дабрачыннасць, крыніцы духоўнай сілы. У гэтым храме я хацеў бы сказаць і пра такую каштоўнасць, як наша царква, пра нашы галоўныя хрысціянскія цэрквы. Менавіта яны заўсёды былі і, я спадзяюся, будуць у цэнтры гэтага яднання. Яны будуць галоўнай сілай, якая аб'ядноўвае народы, нацыю. У дадзеным выпадку нас з вамі", — заявіў Прэзідэнт.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, беларуская ўлада ў асобе Праваслаўнай царквы мае вельмі добрага партнёра, саратніка ўсіх добрых ідэй у дзяржаве, як аднаўленне святыняў, падтрымка сям'і, маральнасці, культурных каштоўнасцяў. "Царква заўсёды падстаўляла сваё плячо нашаму народу. Больш за тое, была ў эпіцэнтры ўсіх падзей, якія адносяцца да гэтых вялікіх каштоўнасцяў", — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка лічыць важным пастырскае слова ва ўмовах неразбярыхі ў сучасным свеце, дзе чалавеку часам вельмі складана зарыентавацца і зразумець працэсы, якія адбываюцца вакол. "І наша царква, не пабаюся гэта без лішняй сціпласці заявіць, — гэта самая адказная царква ў свеце. Самая сумленная, самая шчырая, — адзначыў Прэзідэнт. — Наша царква ніколі не хлусіла свайму народу. Але трэба сказаць, што і мы не давалі падставы для таго, каб царква паводзіла сябе непрыгожа".

Прэзідэнт Беларусі запаліў калядную свечку ля Мінскага абраза Божай Маці ў Свята-Духавым кафедральным саборы. Кіраўніка дзяржавы сустракаў Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. У саборы таксама прысутнічалі прыхаджане, прадстаўнікі праваслаўных брацтваў і сястрыцтваў, навучэнцы нядзельнай школы.

"Я хачу, каб гэтае свята прынесла вам мір, узаемаразуменне, дабрабыт. І самае галоўнае — здзяйсненне калі не ўсіх вашых жаданняў, то галоўных, звязаных з вашымі роднымі, блізкімі, і асабліва дзецьмі, — пажадаў Аляксандр Лукашэнка. — Не прэтэндуючы на нейкую глабальнасць, хацеў бы звярнуцца да расіян, украінцаў, грамадзян Беларусі, да нашых гасцей, ды і да ўсіх хрысціян



БЕЛТА

Аляксандр Лукашэнка і Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі

Аляксандр Лукашэнка:

***Я хачу, каб гэтае свята прынесла вам мір, узаемаразуменне, дабрабыт. І самае галоўнае — выкананне калі не ўсіх вашых жаданняў, то галоўных, звязаных з вашымі роднымі, блізкімі, і асабліва дзецьмі. Не прэтэндуючы на нейкую глабальнасць, хацеў бы звярнуцца да расіян, украінцаў, грамадзян Беларусі, да нашых гасцей, ды і да ўсіх хрысціян з віншаваннямі ў гэты светлы і ўрачысты дзень. З Раством Хрыстовым усіх вас, міру вам і дабра!***

з віншаваннямі ў гэты светлы і ўрачысты дзень. З Раством Хрыстовым усіх вас, міру вам і дабра!"

Прэзідэнт перадаў у дар Беларускай праваслаўнай царкве абраз Божай Маці "Замілаванне", напісаны паводле ўзору маларыцкага абраза "Замілаванне" XV стагоддзя. Ікона выканана ва ўнікальнай старажытнай тэхніцы васковай тэмперы.

У сваю чаргу мітрапаліт Павел падарыў Аляксандру Лукашэнку выяву Іверскага абраза Божай Маці, асвячоную на гары Афон.

"Хочацца пажадаць, каб Маці Божая ахоўвала наш народ, ахоўвала вас — кіраўніка цудоўнай айчыны, дзяржавы, умацоўвала вашы духоўныя і цялесныя сілы. Няхай Маці Божая ахоўвае Белую Русь, увесь наш набожны народ. Каб новы каляндарны год быў для ўсіх нас блаславёным, мірным і паспяховым. І, вядома, як вы заўсёды падкрэсліваеце, шмат у чым гэта будзе залежаць ад нас. Будзем маліцца, працаваць — блаславенне Божае будзе знаходзіцца з усімі намі", — сказаў мітрапаліт Павел.

Васіль **Харытонаў**



БЕЛТА

# Жывая плынь

## У светлыя калядныя дні па традыцыі ўручаюцца прэміі "За духоўнае адраджэнне", а таксама спецыяльныя прэміі дзеячам культуры і мастацтва

Урачыстая цырымонія прайшла ў Палацы Рэспублікі. Узнагарод удастоены людзі, чые дасягненні маюць без перабольшання сусветнае гучанне, праслаўляюць краіну, дапамагаюць захаваць светлую памяць аб каранях, умацоўваюць нашу нацыянальную самасвядомасць і гонар.

Імі адзначаны аўтарскія і працоўныя калектывы за актыўную дзейнасць у гуманітарнай сферы. Сярод лаўрэатаў гэтай высокай узнагароды настаяцель Свята-Елісееўскага Лаўрышаўскага мужчынскага манастыра Навагрудскай епархіі ігумен Яўсевій (Канстанцін Цюхлоў), які ўнёс важкі ўклад у духоўнамаральнае і патрыятычнае выхаванне моладзі, арганізацыю дзейнасці мужчынскага манастыра і аказанне дапамогі людзям у цяжкай жыццёвай сітуацыі, а таксама асобам, якія церпяць ад наркаманіі і алкагалізму. Лаўрэатам прэміі стаў калектыў дзяржаўнай установы "Рэспубліканскі рэабілітацыйны цэнтр для дзяцей-інвалідаў", які праводзіць комплексную работу па рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў, стварэнні безбар'ернага асяроддзя, што дапамагае ім пераадолець пэўныя стэрэатыпы мыслення, усяліць надзею і веру ва ўласныя сілы. Прэміяй адзначаны калектыў установы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка", які актыўна развівае і папулярызуе валанцёрскі рух сярод студэнцкай моладзі, штогод праводзіць больш за 800 дабрачынных акцый, святочных праграм і тэатралізаваных паказаў для выхаванцаў дзіцячых дамоў, школ-інтэрнатаў, сацыяльных прытулкаў, рэабілітацыйных цэнтраў. Узнагароды ўдастоена Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі, якая праводзіць вялікую колькасць мерапрыемстваў, накіраваных на патрыятычнае выхаванне грамадзян, у тым ліку дзяцей, навучэнскай і рабочай моладзі, эканамічна актыўнага насельніцтва, ветэранаў вайны і працы. Адным з такіх мерапрыемстваў стала маштабная рэканструкцыя Кургана Славы. Сярод лаўрэатаў прэміі таксама загадчык кафедры архітэктуры жылых



Лаўрэаты прэміі "За духоўнае адраджэнне" і спецыяльных прэмій дзеячам культуры і мастацтва

# духоўнасці

і грамадскіх будынкаў Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта Сяргей Сергачоў, які стварыў адзіную такую кнігу "Народное зодчество Беларуси. История и современность", работа над якой праходзіла адначасова з яго практычнай дзейнасцю па захаванні аб'ектаў народнага дойлідства, маючых гістарычную і мастацкую каштоўнасць.

Звяртаючыся да лаўрэатаў, а ў іх асобе і да ўсіх суайчыннікаў, Аляксандр Лукашэнка сказаў:

— Кожны год у гэтыя студзеньскія дні мы сустракаемся з асаблівымі людзьмі — тымі, хто лечыць нашы душы, хто захоўвае нашу Памяць, хто служыць Міласэрнасці, Дабру, Прыгажосці.

Творчы шлях ніколі не бывае простым, і сёння на гэтую сцэну выйдуць людзі, якія годна прайшлі яго, заваяваўшы новыя вяршыні ў культуры, мастацтве, журналістыцы, спорце.

Гісторыя дала нашым творчым людзям унікальны шанц — унесці свой уклад у станаўленне беларускай нацыі. Паколькі менавіта мы з вамі, цяперашнія пакаленні, ажыццявілі шматвяковую мару нашых продкаў — стварылі першую ў гісторыі незалежную беларускую дзяржаву. І сёння наша агульная задача — зберагчы краіну і перадаць яе свабоднай і незалежнай тым, хто прыйдзе пасля нас.

Незалежнасць цяжка здабыць. Але яшчэ складаней адстаяць і абараніць.

Сіла духу, з'яднанасць і адзінства — менавіта тыя асновы, той падмурак, без якіх сёння не выжыць.

Яшчэ тысячу гадоў назад Амар Хаям сказаў: "Упавший духом гибнет раньше срока". І гэта вельмі слушна! Паколькі толькі моцны духам чалавек ведае, што рабіць і куды ісці.

Без моцнага стрыжня любому наканавана паражэнне. А нашаму народу сілы духу не займаць! Беларусы перажылі кровапралітныя войны, змаглі выстаяць у цяжкія пасляваенныя часы, аднавілі краіну з руін, а ў нашы дні на скрыжаванні дарог, культур і гістарычных лёсаў адстойваюць суверэнітэт роднай краіны.

Але і дагэтуль знаходзяцца тыя, хто спрабуе паказаць беларусаў людзьмі без роду і племені. З'яўленне такіх галасоў зусім не выпадковае. Незалежная Беларусь, якая жыве сваім розумам і працай, недаспадобы многім.

Прызванне сапраўднага творцы — супрацьстаяць любой хлусні, любому фальшу і крывадушнасці. Тым больш калі размова ідзе пра Айчыну, пра родную зямлю.

Менавіта тут і ёсць поле духоўнай бітвы за Беларусь, за нашы каштоўнасці, ідэалы і традыцыі. І выйграць гэтую бітву, выйграць яе ў душах людзей — вось сапраўднае, вялікае прызванне ўсіх тых, каго мы ўшаноўваем сёння, і тых, хто сабраўся ў гэтай зале.

Аснова нашага нацыянальнага характару — у чалавечнасці, у спачуванні, у дабрыні, у спагадлівасці да чужога гора.

Быць можа, менавіта таму на нашай зямлі традыцыйна ўжываюцца розныя рэлігіі і розныя народы.

Мы ўсё часцей усведамляем Беларусь як агульны дом — сям'ю для ўсіх нас. Тут няма падзелу на сваіх і чужых, у сям'і працуюць разам і дапамагаюць адзін аднаму. Сям'я шчыра радуецца поспехам кожнага і сумесна клапоціцца пра кожнага свайго дамачадца, дзіця, старога. І калі мы гаворым пра інтэграцыйныя працэсы на постсавецкай прасторы, у свеце: чым бліжэй мы плануем, каб гэтыя інтэграцыйныя

працэсы былі, мы зыходзім менавіта з таго, што мы павінны быць як адзіная сям'я. І, самае галоўнае, у гэтай сям'і мы павінны быць раўнапраўнымі. Толькі такія саюзы здольныя выжыць. Іншага не дадзена. Іншым і займацца не трэба. Гэта пустое марнаванне часу.

Беларусь — добрая, спагадлівая, свабодалюбівая, незалежная, жыве ў гармоніі са сваімі суседзямі. Менавіта такая яна сёння. А якой ёй быць праз паўсотні гадоў — шмат у чым залежыць ад тых, хто сёння ў гэтай зале, ад усіх, хто называецца творцам. Бо сіла мастацтва ў тым, што яно можа гаварыць не толькі на мове розуму, але і на мове сэрца...

Нехта сказаў, што мастацтва, творчасць каштоўныя самі па сабе. Не буду спрачацца — быць можа, гэта і так.

Але каштоўнасць мастацтва ўзрастае ў сто разоў, калі яно служыць светлай і высакароднай мэце, калі яно служыць Дабру і Міласэрнасці, калі яно служыць роднай зямлі творцы...

А цяпер пра тое, што дае нам падставу ўдвая радавацца. Пра калег, якія сталі лаўрэатамі спецыяльнай прэміі Прэзідэнта дзеячам культуры і мастацтва. Гэта невялікі аўтарскі калектыў газеты "Голас Радзімы" — загадчык аддзела Іван Ждановіч і спецыяльны карэспандэнт Кацярына Мядзведская. Праца Івана раней неаднаразова адзначалася дыпламамі Мініфармацыі, Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, ён лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў "Залатое пяро" (2015) у намінацыі "Нарыс". А Кацярына Мядзведская атрымлівала дыплом Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў у 2012-м, а таксама Падзячны ліст Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур у 2016 годзе.

Звычайна, традыцыйнае свята ўручэння прэмій, якое стала знакавым для духоўнага жыцця краіны, адзначаецца вельмі ўрачыста, што і зразумела: калядныя дні, пачатак новага года. Пасля ўрачыстасці — вялікі канцэрт. Так было і на гэты раз. Палац Рэспублікі перапоўнены. На другім паверсе шыкоўная ўпрыгожаная ёлка. Тут жа, каля стэндаў, якія прадстаўляюць лаўрэатаў, вялікі натоўп публікі. Усім цікава паглядзець на іх дасягненні. Цікава і мне. Гляджу: вось і наш стэнд, ён падрыхтаваны рэдакцыйнымі дызайнерамі. Што ж, мяркую, зроблена выдатна. Партрэты Івана і Кацярыны як творы мастацтва. Падыходзяць іх сябры і родныя, віншуюць, фатаграфуюцца разам з намінантамі. Пакуль Аляксандр Лукашэнка прэміі не ўручыў, іх так называюць. Гучыць музыка…

Гэта сапраўды цудоўны знакавы дзяржаўны праект, калі ў зале Палаца Рэспублікі можна пабачыць эліту нашага грамадства. У першых радах — ветэраны вайны і працы, прадстаўнікі розных канфесій. Прыемна, дарэчы, было бачыць, як сардэчна вітаюць адзін аднаго ксёндз і праваслаўны святар. Тут жа недалёка і муфтый мусульман Беларусі Абу-Бекер Шабановіч. Дарэчы, зусім нядаўна была адкрыта ў Мінску Саборная Мячэць. І ўсе мы сталі сведкамі таго, што гэта свята для вернікаў розных нацыянальнасцяў усёй краіны… А цяпер мы — сведкі радасці за сваіх калег па пяру. Я размаўляла з імі пра выданне і пра тое, чым адметная іх праца.

"Голас Радзімы", нагадаю, выходзіць з 1955 года, выдаецца на беларускай мове, з 2006 года гэта адно з выданняў рэдакцыі газеты "Советская Белоруссия", арыентаванае найперш на суайчыннікаў, беларусаў замежжа. Тыраж — каля 2000 экзэмпляраў, а сайт http://www.golas.sb.by/ на партале "СБ" робіць выданне, у тым ліку яго архіў, даступным для чытачоў па ўсім свеце. У апошнія гады аўтарскаму калектыву газеты дзякуючы выкарыстанню сучасных тэхнічных магчымасцяў, найперш электроннай пошты, удалося наладзіць дзелавыя і творчыя сувязі з актывістамі, няштатнымі аўтарамі шэрага беларускіх суполак замежжа. Дзякуючы такой сістэмнай, паўсядзённай рабоце значна пашыралася геаграфія публікацый. У прыватнасці, у газеце змяшчаюцца артыкулы пра жыццё беларусаў, культурна-асветніцкую дзейнасць грамадскіх аб'яднанняў, культурных цэнтраў у розных краінах. Гэта найперш краіны з постсавецкай прасторы, а таксама Польшча (там дзейнічае Беларускае грамадска-культурнае таварыства), краіны Лацінскай



Іван Ждановіч і Кацярына Мядзведская

Амерыкі, заявілі пра сябе суайчыннікі ў Італіі, Швейцарыі, Аўстрыі, апошнім часам і Францыі (там створана беларуская суполка). Супрацоўнікі газеты ўвесь час на сувязі з актывістамі суполак, абмяркоўваюць з імі новыя ідэі, падтрымліваюць творчыя ініцыятывы, скіраваныя на пашырэнне беларускай культуры, духоўнай спадчыны нашага народа ў замежжы. Актыўна спрыяюць журналісты "ГР" і ўтварэнню новых суполак, наладжванню кантактаў паміж творчымі гуртамі, суполкамі замежжа з партнёрамі ў Беларусі. А, напрыклад, суполка беларусаў ва ўкраінскім горадзе Мікалаеве так і названа: "Голас Радзімы" — у знак удзячнасці газеце за вялікую падтрымку пры станаўленні грамадскай арганізацыі.

Немалаважна, што каштоўны досвед культурнага жыцця беларусаў

у замежжы дзякуючы публікацыям у газеце "Голас Радзімы" пашыраецца і адначасова становіцца важным складнікам нашай нацыянальнай культуры. Як вядома, у краінах замежжа, паводле розных падлікаў, жыве звыш трох мільёнаў беларусаў. У месцах новага жыцця, асабліва кампактнага пражывання (расійская Сібір, Казахстан, Украіна, Латвія, Літва, Польшча…) яны зберагаюць традыцыі продкаў, іх абрады, мову, песні. У прыватнасці, публікацыі газеты расказвалі пра жыццё беларусаў у Днепрапятроўскай і Львоўскай абласцях (Украіна), а таксама ў Цюменскай, Іркуцкай, Новасібірскай, Краснаярскай абласцях (Расія), пра творчыя справы, культурна-асветніцкія праекты беларусаў Малдовы, Польшчы, Латвіі, Літвы, Эстоніі. Напрыклад, летась па ініцыятыве Саюза беларусаў Латвіі (ім кіруе Валянціна Піскунова) Дні беларускай культуры ў Латвіі прысвячаліся 525-м угодкам знакамітага першадрукара і асветніка Францыска Скарыны, праходзілі больш за месяц, у тым ліку і з удзелам дзеячаў культуры, калектываў з Беларусі. У розных гарадах краіны ладзілася больш за 15 масавых мерапрыемстваў. Супрацоўнікі рэдакцыі палічылі: карысны досвед варты пашырэння. Пры дапамозе пазаштатнага аўтарскага актыву "ГР" з Латвіі быў падрыхтаваны шэраг грунтоўных публікацый на гэтую важную тэму.

Пра багацце беларускай культуры сведчаць і народныя абрады, традыцыі, святы, фестывалі. Расказваючы пра іх, газета не абмяжоўваецца інфармаваннем пра саміпадзеі. У тэкстах прыадкрываецца глыбокі духоўны сэнс народных традыцый, асаблівасці светаўспрымання беларусаў, што выяўляюцца ў святах, абрадах. У прыватнасці, штогод як на Беларусі, так і ў розных беларускіх суполках свету ладзіцца Купалле. Цяпер, як вядома, свята трансфармуецца, прыстасоўваецца да мясцовых умоў. І ў 2016 годзе газета расказвала пра адметныя Купальскі "Дагда-фэст" (Латвія), пра тое, як адзначалі свята беларусы ў Іркуцкай вобласці, як праходзіла яно пад Полацкам (Экімань), на беразе Дняпра (у Александрыі), а таксама ў Львове (Украіна), Даўгаўпілсе (Латвія) і на беразе Днястра ў Малдове. Такая мазаіка ў падачы матэрыялаў і заахвочвае арганізатараў да творчай працы на карысць беларускай культуры, і стымулюе нештатных аўтараў да супрацы з газетай, і пашырае карысны досвед, дае прыклад для іншых суполак. А чытачы далучаюцца да народных традыцый, згадваюць пра сваю ўласную духоўную спадчыну — таму і спрабуюць адладзіць сувязі з зямлёй продкаў, з раднёй у Беларусі.

***Спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Беларусі за плённае супрацоўніцва з суайчыннікамі за мяжой і прафесійнае асвятленне пытанняў міжкультурнага дыялогу ў Беларусі ўзнагароджаны аўтарскі калектыў рэдакцыі газеты "Голас Радзімы" — загадчык аддзела Іван Ждановіч і спецыяльны карэспандэнт Кацярына Мядзведская***

Шэраг матэрыялаў выдання — пад рубрыкамі "Планета людзей", "Супольнасць", "Разам" ды іншымі — прысвечаны тэмам міжнацыянальнай і міжканфесійнай згоды ў краіне. Для людзей розных нацыянальнасцяў Беларусь — родная зямля. Газета расказвае, як удаецца зберагчы мір і згоду ў нашым грамадстве. У прыватнасці, штораз публікацыі прысвячаюцца фестывалю нацыянальных культур у Гродне, падрыхтоўцы да яго. Шырока асвятляецца міжнародны праект апарату Упаўнаважанага па справах рэлігій і нацыянальнасцяў "Беларусь шматнацыянальная". Гэта выезд творчых гуртоў, кіраўнікоў розных этнасуполак краіны ў госці да беларусаў замежжа, абмен там досведам працы, канцэрты, творчыя сустрэчы, удзел у фэстах ды іншых сумесных культурных мерапрыемствах.

Газета расказвае таксама, як суполкі беларусаў у розных краінах выступаюць своеасаблівымі інтэгратарамі, міратворцамі падчас правядзення сваіх мерапрыемстваў. Скажам, у "Беларускім Купаллі" ў Львове сёлета ўдзельнічалі як актывісты ўкраінскіх суполак, так і рускіх. А беларусы Малдовы, па традыцыі ладзячы Купалле на Днястры, працуюць супольна з актывістамі рускай дыяспары. У сваёй працы беларусы Даўгаўпілса (Латвія), Нарвы (Эстонія) далучаюць да творчых праектаў адпаведна латышоў, эстонцаў. Беларусы з Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага сябруюць з мясцовымі чувашскай і бурацкай этнасуполкамі, актывісты Беларускага зямляцтва Алтая — з мясцовымі суполкамі, што праяўляюць інтарэс да славянскіх традыцый. Творчыя гурты беларусаў з Астаны (Казахстан) ладзяць сумесныя выступленні з бабулямі-казашкамі, якія спяваюць казахскія народныя песні. І такіх прыкладаў "сяброўства народаў", што ўмацоўваецца праз пасрэдніцтва беларусаў, на старонках "Голасу Радзімы" знойдзецца шмат.

Асаблівая ўвага ў газеце надаецца духоўнай, літаратурна-мастацкай спадчыне беларусаў. Рыхтуюцца адметныя матэрыялы да юбілеяў класікаў літаратуры, пра сувязі беларускай літаратуры, беларускіх літаратараў з прадстаўнікамі іншых культур. Сумесна з Дзяржаўным музеем гісторыі беларускай літаратуры падаецца цыкл "Літаратурныя падарожжы". Ён і пачынаўся ў музеі з аповеду пра 120-дзённае пешае падарожжа ўздоўж дзяржаўнай мяжы (1996 год), якое ажыццявіў Іван Ждановіч разам з аўтарам гэтых радкоў. На вечарыне гучалі вершы, напісаныя ў падарожжы, урыўкі з падарожных нарысаў, надрукаваных у часопісах "Беларусь" і "Маладосць".

Спадзяюся, высокая ўзнагарода толькі падахвоціць маіх калег на далейшую творчасць і на супрацоўніцтва з часопісам. Мы ж у адной звязцы.

Валянціна **Ждановіч**

# Будаўнікі пацвердзілі рэпутацыю

**Гэта падаецца неверагодным, але дарожнікі сапраўды здзейснілі немагчымае. За год з нечым яны праклалі звыш 40 кіламетраў камфортнай чатырохпалоснай дарогі, якая злучыла трасу Мінск — Гродна з так званай “алімпійкай” (аўтадарогай Брэст — Мінск — граніца Расіі). Гэта дало магчымасць замкнуць другое кальцо вакол сталіцы.**

Скажам прама, аўтамабілісты атрымалі добры падарунак да Новага года. А будаўнікі могуць ганарыцца тым, што іх работа атрымала вельмі высокую ацэнку экспертаў Сусветнага банка. Яны сказалі шчыра: у Беларусі ўмеюць будаваць дарогі ў два разы танней і пры гэтым нічуць не горш, чым у суседзяў. На ўрачыстую цырымонію адкрыцця другой кальцавой дарогі ў Дзяржынскі раён прыязджаў Прэзідэнт Беларусі і асабіста ацаніў якасць новай аўтамагістралі.

На адкрытай мясцовасці ад сырога пранізлівага ветру нас, журналістаў, не ратаваў нават гарачы чай, клапатліва прызапашаны арганізатарамі мерапрыемства. А вось Міністра транспарту і камунікацый Анатоля Сівака, падаецца, грэла сама думка, што ў краіне з’явілася яшчэ адна сучасная і вельмі важная аўтатраса. Яе першы ўчастак здалі яшчэ летась. Ён злучыў дарогі Мінск — Віцебск і Мінск — Гродна. І вось цяпер фінішаваў другі этап будаўніц-



АРТУР ПРУПАС



ВАДЗІМ КАНДРАШОЎ

тва. Агульная працягласць МКАД-2 складае каля 160 кіламетраў. Наконт гэтага Міністр з задавальненнем пагутарыў з журналістамі:

— Увод другога ўчастка яшчэ больш разгрузіць першую кальцавую вакол Мінска, аб’яднаўшы транзітныя шляхі найважнейшых транс’еўрапейскіх калідораў Поўнач — Поўдзень і Захад — Усход. Гэта не толькі палепшыць экалагічную сітуацыю ў Мінску, але і будзе стымуляваць развіццё прылеглай да новай дарогі тэрыторыі, у тым ліку лагістычнай інфраструктуры і гарадоў-спадарожнікаў.

Цалкам задаволеным выглядаў і старшыня праўлення Банка развіцця Сяргей Румас: каля 75 працэнтаў інвестыцый у МКАД-2 — гэта грошы менавіта гэтага банка.

Будаваць МКАД-2 вырашылі, калі зразумелі, што дзеючая кальцавая знаходзіцца на мяжы сваіх магчымасцяў. На асобных яе ўчастках інтэнсіўнасць руху складае 120 тысяч машын у суткі. Цяпер значную частку транзітнага транспарту прыме на сябе другая кальцавая. Тым больш што пабудавана яна па самых сучасных тэхналогіях, з цэментабетонным пакрыццём. Гэта амаль у два разы павышае тэрмін яе службы і ў столькі ж разоў зніжае выдаткі на рамонт і ўтрыманне. У хуткім часе ўздоўж усёй трасы пабудуюць дзясяткі аб’ектаў прыдарожнага сэрвісу.

Адкрываючы аўтамагістраль, Прэзідэнт цёпла падзякаваў прадстаўнікам працоўных калектываў дарожна-будаўнічых арганізацый за прароблену працу:

— Дарога атрымалася прыгожай і надзейнай. Пройдзе шмат гадоў, і мы будзем ганарыцца, што пабудавалі такую аўтамагістраль.

***Будаўнікі могуць ганарыцца тым, што іх работа атрымала вельмі высокую ацэнку экспертаў Сусветнага банка***

Зрэшты, гаварылі не толькі пра новую дарогу. Падзеі ва Украіне істотна павышаюць значнасць транзітнага патэнцыялу нашай краіны. Значыць, ужо трэба думаць пра новыя праекты. І ў прыватнасці, пра рэканструкцыю аўтадарогі М-10 граніца Расіі — Гомель — Кобрын. Гэты калідор скарачае транспартны шлях паміж ЕС і Кітаем і ідзе ў абход загружаных вузлоў Масквы і Мінска. Цяпер на грошы Сусветнага банка вядзецца рэканструкцыя дарогі Мінск — Гродна. У перспектыве прагладаецца абнаўленне дарогі на Полацк.

Якасць міжнародных і рэспубліканскіх магістраляў — гэта не толькі імідж краіны, але і вялікія грошы. Аднак Аляксандр Лукашэнка нагадаў: робячы ўпор на галоўных артэрыях, нельга забываць пра дарогі мясцовага значэння. У бліжэйшы час будзе распрацаваны план па іх рэканструкцыі і вызначаны механізм фінансавання. За пяцігодку трэба будзе зрабіць прыстойныя дарогі да кожнага аграгарадка.

Уладзімір **Хромаў**




# Пенсійная справа ў новым фармаце

**З 1 студзеня пачалося паэтапнае павышэнне пенсійнага ўзросту, так што ўжо ў 2022 годзе жанчыны будуць выходзіць на пенсію ў 58 гадоў, а мужчыны — у 63 гады**

## Прадстаўнікі Мінпрацы і сацабароны расказалі:

**Пра чаканы эфект**

— Павышэнне пенсійнага ўзросту дасць магчымасць не памяншаць пенсіі ва ўмовах старэння насельніцтва.

**Пра накапляльны элемент:**

— З улікам негатыўнага досведу іншых краін і фактычных умоў Беларусі ўвядзенне ў дзяржаўную пенсійную сістэму абавязковага накапляльнага элемента не плануецца. Пры гэтым, напрыклад, страхавымі арганізацыямі прапануюцца добраахвотныя праграмы страхавання дадатковай пенсіі. Зберажэнні на старасць можна фарміраваць і ў банку.

**Пра стаж для назначэння пенсіі:**

— Рашэнне аб павышэнні мінімальнага патрэбнага стажу да 20 гадоў працы з выплатай узносаў прадыктавана ў першую чаргу дэмаграфічнымі зменамі — старэннем насельніцтва, павелічэннем агульнай працягласці жыцця і адпаведна перыяду атрымання пенсіі (сёння яе атрымліваюць у сярэднім каля 20 гадоў). Аднак у перспектыве ад пытанняў, звязаных з карэкціроўкай стажу, верагодна, таксама не адысці. У эканамічна развітых краінах у гэтым плане ўстанаўліваюцца яшчэ больш жорсткія патрабаванні.

**Пра іншыя змены:**

— На бліжэйшыя шэсць гадоў рашэнне па пенсійным узросце прынята, ён будзе павялічвацца паступова. Што датычыцца доўгатэрміновага перыяду, тут важна, як будуць складвацца дэмаграфічныя працэсы, як будзе працаваць эканоміка, якая будзе сітуацыя з паступленнем узносаў у бюджэт Фонду сацабароны насельніцтва. Значэнне будуць мець занятасць, міграцыя і г.д.

**Пра гарантыі для спецыялістаў больш сталага ўзросту:**

— Ахоўныя нормы ў працоўных адносінах для работнікаў перадпенсійнага ўзросту захоўваюцца, адпаведныя змены ў заканадаўства ўжо прыняты. Пры гэтым у многіх работадаўцаў запатрабаваны менавіта спецыялісты старэйшага ўзросту — з улікам іх досведу, высокай кваліфікацыі, практычнага стажу.

Таццяна **Патворава**



# Беспрацоўнага падтрымае страхоўка,

## альбо Якой бачыцца падушка бяспекі пры звальненні

Ідэя простая. Калі чалавек працаваў і плаціў страхавыя ўзносы, то пры банкруцтве прадпрыемства або скарачэннях ён зможа атрымліваць дадатковыя грошы разам з іншымі сацыяльнымі дапамогамі.

Пра планы ўвесці падобную схему яшчэ год назад заяўляў першы намеснік Міністра працы і сацыяльнай абароны Андрэй Лабовіч. І вось Мінпрацы пацвердзіў, што ў 2017 годзе павінны быць гатовыя праекты некалькіх дакументаў, у якіх давядзецца вызначыць, як будзе фінансавацца сістэма, якімі павінны быць мінімальны страхавы стаж і тэрмін выплаты дапамогі.

— У некаторых краінах выкарыстоўваецца страхаванне ад беспрацоўя. Гэта адна з формаў сацабароны эканамічна актыўнага насельніцтва ад рызыкі страты працы па розных прычынах, — гаворыць віцэ-спікер Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Мар'яна Шчоткіна.

Некаторыя эксперты прапаноўваюць выкарыстоўваць заходні досвед, гэта значыць ускласці частку расходаў па страхоўцы на работніка.

— Сусветная практыка паказвае, што адзін з аптымальных спосабаў — індывідуальнае страхаванне, — гаворыць эксперт Цэнтра эканамічных даследаванняў BEROC Марыя Акулава. — Дзяржава і прадпрыемства павінны рабіць адлічэнні ў фонд сацабароны, але адначасова і сам работнік пры такой схеме рэгулярна пералічвае пэўную суму. Ён стварае ўласную падушку бяспекі. Калі наступіць страхавы выпадак, першыя пяць месяцаў дапамога выплачваецца з дзяржаўнай крыніцы, а потым з уласных назапашаных сродкаў.

На думку эксперта, цяпер трэба рабіць акцэнт на папулярызацыі індывідуальнага прадпрымальніцтва і самазанятасці замест субсідзіравання неэфектыўных актываў. Грошы лепш накіраваць на падтрымку малога бізнесу. Можна даваць для дробных фірмаў і падатковыя канікулы. Гэта павысіць ролю прыватнага сектара. Марыя Акулава выступае і за змену сістэмы перакваліфікацыі беспрацоўнага насельніцтва, якая, на яе пагляд, пакуль не зусім здольная задавальняць запыты рынку.

— Цяпер нельга дакладна сказаць, якім менавіта будзе страхаванне ад беспрацоўя, — акцэнтуе ўвагу старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях Тамара Красоўская. — Але, магчыма, спачатку асноўную нагрузку возьме на сябе дзяржава. Затым паэтапна, пры ўмове росту зарплат, паступова выплаты будуць перакладацца на наймальнікаў і работнікаў. Цяжка сказаць, колькі грошай чалавек атрымае пры страце працы. Гэта, верагодна, будзе залежаць ад страхавога стажу ды іншых фактараў. Напэўна, памер выплат будзе прывязаны да бюджэту пражытачнага мінімуму або, скажам, да мінімальнай заработнай платы. Потым, можа быць, сума будзе залежаць ад страчанага заробку. Выплаты ў выпадку страты працы, думаю, будуць часовымі. У сусветнай практыцы памер страхавой выплаты па сканчэнні пэўнага тэрміну зніжаецца.

Цяпер у краіне ёсць дзяржаўная дапамога для тых, хто страціў працу і ўстаў на ўлік у цэнтры занятасці. Звычайна гэта не больш за 1375 расійскіх рублёў у месяц. Акрамя гэтага, улады абяцаюць беспрацоўным усялякую падтрымку, да прыкладу, субсідыі на адкрыццё сваёй справы. Сёлета 1,3 тысячы чалавек скарысталіся такім стартавым капіталам (сума ад адной да дзвюх тысяч долараў).

Васіль **Малашанкаў**

# Вялікі патэнцыял “малога”

**На малы бізнес ускладаюцца вялікія надзеі. У 2017 годзе за кошт з’яўлення і развіцця малых прадпрыемстваў, стварэння ў іх новых працоўных месцаў эканоміка павінна павялічыцца не менш як на 0,8 працэнта. Гэта, дарэчы, практычна палова ўсяго прагназуемага прыросту ВУП. А ў 2020 годзе яго ўзровень, які фарміруецца такім бізнесам, павінен вырасці да 2,5 працэнта. Ці пад сілу такія задачы?**



БЕЛТА

ТАА “Палімайстар” ужо больш за 20 гадоў паспяхова працуе над стварэннем прыбораў, абсталявання і сістэм, якія дапамагаюць абараніць чалавека і асяроддзе яго пражывання ад радыяцыйных пагроз

Урад настроены аптымістычна. Так, Прэм’ер-міністр Андрэй Кабякоў нядаўна заявіў, што лічыць малы і сярэдні бізнес магутнай эканамічнай сілай. У якасці аргументаў прывёў некалькі лічбаў. Сёння прадпрымальніцтва фарміруе больш за 24 працэнты нашага ВУП, 28,5 працэнта падатковых паступленняў у бюджэт, а таксама яго доля ў агульным аб’ёме экспарту краіны складае 26,5 працэнта. У гэтай сферы заняты кожны трэці жыхар краіны. І далей, трэба меркаваць, будзе больш. Тым больш што раскняволенне дзелавой ініцыятывы, фарміраванне ўстойлівага вядзення бізнесу, стварэнне спрыяльных умоў для прадпрымальніцтва разглядаецца як важнейшы рэсурс развіцця краіны на бягучую пяцігодку.

Зразумела, што разлічваць на рост малога і сярэдняга бізнесу без пэўнай пад-

трымкі такіх прадпрыемстваў было б недарэчна. Гэта як вырошчваць расліны на сухой глебе без падкормкі ўгнаеннямі. На якіх момантах абяцалі сканцэнтравацца ва Урадзе?

Па-першае, будзе прадоўжана работа па ўдасканаленні ліцэнзійнага заканадаўства. Па-другое, у парадку работы дзяржорганаў — перавод на электронны фармат адміністрацыйных працэдур і скасаванне неабгрунтаваных праверак. А таксама пераход на планавую работу грамадска-кансультатыўных і экспертных саветаў. Гэта, як чакаецца, дасць магчымасць актывізаваць работу дзяржавы і бізнесу па актуальных пытаннях прадпрымальніцтва. Дарэчы, дыялог у апошні час сапраўды выбудаваўся.

Паказальным у гэтым плане стала вызначэнне пераможцаў конкурсу “Прадпрымальнік года”. Пры яго правядзенні ўлічваліся кіраўніцкі талент, фінансавыя паказчыкі, сацыяльная функцыя і значнасць бізнесу. Выбіраць лепшых даручылі журы, якое напалову складаецца з прадпрымальнікаў і бізнес-асацыяцый. Такі падыход, на думку старшыні прэзідыума Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва Уладзіміра Карагіна, стварыў пэўны эканамічны і сацыяльны ліфт. Раней пасля аб’яўлення вынікаў падобных конкурсаў ствараласа ўражанне, што ў краіне з году ў год працуюць адны і тыя ж прадпрыемствы. Цяпер жа на слыху імёны навічкоў, якія за апошнія 2-5 гадоў дасягнулі вялікіх вынікаў. Пра іх поспех па заказе Мінэканомікі зроблены 30-секундныя ролікі, якія хочуць запусціць па ТБ у рэгіёнах. Лагічна, што нагляды прыклад суседа павінен матываваць. А тым часам самі пераможцы атрымалі магчымасць з вуснаў нашых і міжнародных прафесіяналаў даведацца пра стратэгіі развіцця сваёй справы.

У бізнес-асацыяцыях настойваюць: усім бы прадпрымальнікам

**24 %**
**ВУП**

з рэгіёнаў, якія сталі на ногі, праходзіць такія майстар-класы. Нягледзячы на тое, што ў краіне дзейнічае сетка падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу, якая складаецца з 90 цэнтраў падтрымкі прадпрымальніцтва і 19 бізнес-інкубатараў, некаторыя памацнелыя ініцыятывы развіваюцца інтуітыўна. Так што досвед і парады экспертаў не перашкодзілі б. Тым больш што, паводле слоў Уладзіміра Карагіна, у бліжэйшыя гады колькасць бізнесаў павінна павялічыцца з 360 да 800 тысяч. І без паралельнай лібералізацыі заканадаўства, упэўнены старшыня прэзідыума РКП, не абысціся. Напрыклад, трэба стварыць законы аб самарэгулявальных арганізацыях і адносінах работадаўцы і наёмных работнікаў у прыватным партнёрстве, гаворыць Карагін. Чакаецца, што спросціць работу з’яўленне ацэнкі рэгулюючага ўздзеяння нарматыўна-прававых актаў на рэальны сектар.

Зрэшты, саміх бізнесменаў цікавяць больш не пытанні, як ім рысавацца на публіцы, а даступнае крэдытаванне. У бліжэйшай будучыні макраэканамічныя ўмовы, у тым ліку пытанні даступнасці крэдытаў, будуць больш спрыяльныя, адзначыў Старшыня Праўлення Нацбанка Павел Калаур. Зрэшты, некаторыя зрухі ёсць ужо цяпер. Падчас узнагароджання пераможцаў іншага конкурсу — “Прадпрымальнік года” па версіі аўдытарскай кампаніі EY (“Эрнст энд Янг”) — старшыня праўлення Банка развіцця Сяргей Румас расказаў: “Урад адобрыў прыцягненне пазыкі Сусветнага банка на 40 мільёнаў долараў на падтрымку малога і сярэдняга бізнесу”. Акрамя таго, у рамках гэтай ініцыятывы плануецца паніжэнне стаўкі па рублёвых крэдытах. Грошы, гавораць бізнесмены, даюць больш свабоды для дзеянняў.

Марыя **Друкава**

**Стратэгію развіцця малога і сярэдняга бізнесу да 2030 года ўжо рыхтуюць у краіне. Дырэктар Дэпартамента па прадпрымальніцтве Мінэканомікі Пётр Арушаньянц не хавае, што задача няпростая:**



*— Калі падышлі да ідэі распрацоўкі стратэгіі, у першую чаргу сутыкнуліся з пытаннем, як можна планаваць на 15 гадоў наперад, калі невядома, што будзе праз два гады. Тым не менш жыццё патрабуе, каб стратэгія была. Мы павінны разумець, што будзе з бізнес-саюзамі, інфраструктурай падтрымкі прадпрымальніцтва... Пытанняў шмат, таму работу трэба планаваць, каб кожны бачыў арыенціры. Некалі мы планавалі праграму малога і сярэдняга прадпрымальніцтва на 3 гады, але потым зразумелі, што і тэндэнцыі за 5 гадоў можна больш прадугледзець. Каб гаварыць пра паслядоўныя інстытуцыйныя змены, трэба мець на ўвазе некалькі пяцігодак. Для ўпэўненасці мы плануем, што стратэгія ператворыцца ў сур’ёзны дакумент — рашэнне Урада ці Прэзідэнта. Бо перад намі стаіць задача нарасціць долю малога і сярэдняга бізнесу ў эканоміцы да 50 працэнтаў да 2030 года. Там не будзе пытанняў рэфармавання дзяржапарату, але будуць усе пытанні, якія датычацца малога і сярэдняга прадпрымальніцтва, пачынаючы ад адміністрацыйных працэдур, ліцэнзавання і заканчваючы кропкавымі пытаннямі фінансавай падтрымкі, кансультатыўных праграм, навучання.*




# У сталіцы з'явяцца спадарожнікі

**Якім будзе Мінск праз паўтара дзесяцігоддзя, беларускія архітэктары ведаюць дакладна. І дар яснабачання тут ні пры чым. Далягляды заўтрашняга дня сталіцы раскрывае Генеральны план развіцця да 2030 года.**

Першым такім дакументам у сваёй суверэннай гісторыі горад абзавёўся ў 2003 годзе. Тады здавалася, Генплан улічвае ўсе сусветныя горадабудаўнічыя трэнды і будзе актуальным да 2020 года. Любы план — дакумент, а не манумент. З тых часоў яго карэкціравалі двойчы. Восенню 2016 года тэрмін яго дзеяння прадоўжылі да 2030 года.

— Надаць годную агранку гораду — такая задача пастаўлена перад намі Прэзідэнтам. Гэта азначае навесці горадабудаўнічы парадак. Спрабуем пераглядзець стратэгію інерцыйнага, экстэнсіўнага развіцця, — сказаў галоўны архітэктар “Мінскграда” Аляксандр Акенцьеў.

## Дэмаграфічны паталок

Зыходны пункт планавання жыцця любога населенага пункта, а тым больш сталіцы, — адказ на пытанне: “Колькі ў ім будзе жыхароў праз …наццаць гадоў?”

Пяць гадоў назад спецыялісты думалі, што сталіца ступіць за МКАД і будзе прырастаць пасёлкамі. Атрымлівалася, што да 2030 года насельніцтва Мінска можа скласці 2,2 мільёна жыхароў. Але ўжо сёння Мінск — “асяроддзе пражывання” для кожнага пятага жыхара краіны. Што відавочны перабор. Будаўніцтва жылля таксама істотна апярэджвае тэмпы ўзвядзення сацыяльных аб'ектаў — паліклінік, школ, дзіцячых садоў, культурных цэнтраў.



Гэтую стратэгію палічылі памылковай. Мінск застанецца кампактным. Вырашана, што аптымальная колькасць “сталічных штучак” — два мільёны. Гэтае рашэнне фактычна вядзе да абмежавання прапіскі ў сталіцы, як гэта было ў часы СССР.

Затое стануць развіваць гарады-спадарожнікі Рудзенск, Дзяржынск, Лагойск, Фаніпаль і Смалявічы. Адначасова іх насельніцтва вырасце на сто тысяч чалавек. Большай часткай за кошт мінчан, якія захочуць хутчэй вырашыць сваё кватэрнае пытанне — там будуюць жыллё з дзяржпадтрымкай. Таксама можна атрымаць зямлю пад будаўніцтва ўласнага дома.

— У Мінску аб’ёмы жыллёвага будаўніцтва ўжо праз год знізяцца ўдвая. А гарады-спадарожнікі змогуць канкурыраваць са сталіцай па ўзроўні камфорту, — гаворыць старшыня Камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама, галоўны архітэктар Мінска Павел Лучыновіч.

*Мінск удасканаліў стратэгію — пашырацца не будзе*

## Ідавочная міграцыя прадпрыемстваў

Выведуць з горада і буйныя прадпрыемствы. Вось жывы прыклад: вядомая беларуская фабрыка “Галантэя”, якая выпускае скураныя вырабы і аксэсуары, знаходзіцца за кіламетр ад Дома Урада. Зразумела, што такой вытворчасці не месца ў самым сэрцы сталіцы. Яе перанясуць у Смалявічы.

Каб прадпрыемствы актыўней перабіраліся ў глыбінку, выкарыстоўваюць эканамічныя рычагі — павышаюць плацяжы за зямлю.

## Тут будзе горад-сад

Якім жа ўбачаць мінчане і госці сталіцы Мінск праз пятнаццаць гадоў? Горадабудаўнікі запэўніваюць — сучасным, чыстым, зручным для жыцця. Адзін з галоўных недахопаў Генплана-2003 быў у тым, што яго распрацоўшчыкі не ўлічылі магчымасці бурнага росту колькасці асабістага аўтатранспарту.

Сёння стаўка робіцца на развіццё грамадскага транспарту, перш за ўсё метро. Прадоўжана першая лінія сталічнай падземкі. Поўным ходам ідзе будаўніцтва трэцяй лініі працягласцю каля 25 км.

Стаіць задача, каб можна было даехаць ад МКАД да цэнтра за трыццаць хвілін. Гэта будзе “залаты” сталічны стандарт. Дабудуюць другую Мінскую кальцавую аўтадарогу, якая звяжа гарады-спадарожнікі і абмяжуе ўезд транзітнага грузавога транспарту.

З горадабудаўнічай палітыкі знікае паняцце мікрараёнаў. Сучасны падыход — пераход на сістэму кварталаў. Будаваць, планаваць добраўпарадкаванне і рамонтныя работы будуць цяпер з улікам квартальнага дзялення.

Яшчэ з’явіцца больш за дзве тысячы гектараў новых паркаў і сквераў. Перш за ўсё ў спальных раёнах. У планах і далейшая рэканструкцыя набярэжнай ракі Свіслач, унікальных Лошыцкай водна-паркавай і Сляпянскай водной сістэм.

Вольга **Карнеева**




# 5 сучасных праектаў, якіх чакае краіна

## Трэцяя лінія метро, 2020 год

**1** Дзякуючы падземцы мегаполіс сёння не вельмі пакутуе ад транспартных пробак, ад якіх задыхаюцца многія буйныя гарады свету. Новая лінія з чатырнаццацю станцыямі ўвойдзе ў строй праз чатыры гады. Прыкладна ў гэтыя ж тэрміны пачнецца будаўніцтва чацвёртай кальцавой лініі.

## Нацыянальны стадыён, 2018 год

**2** Цяжка паверыць, але ў беларускай сталіцы няма сучаснага стадыёна, які мог бы прымаць спаборніцтвы высокага сусветнага ўзроўню. Такія, як, напрыклад, другія Еўрапейскія гульні, што пройдуць у Мінску ў 2019 годзе.

На званне новага архітэктурнага брэнда Мінска прэтэндуе праектуемы Нацыянальны стадыён. Яго ўзвядуць у раёне Мінскага трактарнага завода. Выглядаць ён будзе яшчэ круцей, чым "касмічны" стадыён каманды БАТЭ ў Барысаве.



ВАДЗІМ КАНДРАШОЎ

## Турыстычнае прыцягненне

**Мінск ізноў узначаліў рэйтынг самых даступных сталіц для зімовага адпачынку расіян. Прычым пры складанні гэтага топа ўлічваліся звесткі пра кошт пералёту з Масквы ў абодва бакі, а таксама цана двух начэй у трохзоркавых гатэлях 35 еўрапейскіх сталіц.**

Як сведчаць дадзеныя даследавання, праведзенага расійскім парталам “Лента.ру”, адпачынак у Мінску абыдзецца ў 8.886 расійскіх рублёў — прыкладна 139 долараў ЗША. З гэтай сумы крыху больш за 61 долар прыпадае на пералёт, яшчэ 77,5 — на гасцініцу. Пры гэтым вылет з падмаскоўнага аэрапорта “Жукоўскі” дасць магчымасць добра зэканоміць на білетах.

Мінская прывабнасць — і не толькі цаной гасцініц — зусім не здзіўляе маскоўскага краязнаўцу і блогера Аляксандра Усольцава. На мінулым тыдні ён быў у ліку прадстаўнікоў расійскіх СМІ, якія наведалі з вялікім прэс-турам Беларусь. Менавіта ім было зададзена нашаму Прэзідэнту пытанне пра развіццё турызму — тэма гэтая аматару і знатаку падарожжаў вельмі блізкая. Як блізкая і сама беларуская сталіца:

— Мінск для мяне больш, чым проста горад. Бываў у ім шмат разоў — і штораз па-новаму ўлюбляўся ў яго ўклад жыцця, яго ўпарадкаванасць і мернасць. Менавіта ў Мінску 9 гадоў назад я зрабіў прапанову будучай жонцы — і не шкадую, што гэта было менавіта ў гэтым цудоўным горадзе.

Аляксандр Усольцаў бачыць мноства прычын, якія дазваляюць яму рэкамендаваць сваім суайчыннікам пабываць у Беларусі і яе сталіцы:

— Адзін праспект Незалежнасці чаго варты! Вялікія прасторы і сталінскія дамы ў ідэальным выглядзе — такое ў Маскве калі толькі на Цвярской можна пабачыць. Часам гэта дрэнна, часам добра, але для турыста адназначна прыемна, калі ўсюды чыста, ёсць падсветка, а на вуліцах стапрацэнтна бяспечна. Усім гавару: калі не былі ў Мінску, то абавязкова наведайце яго. І Беларусь наогул!

На другім месцы свежага рэйтынга размясціўся Вільнюс — 183 долары. Трэцюю пазіцыю займае Будапешт (187 долараў). Таксама ў дзясятку лідараў увайшлі Кіеў, Рыга, Браціслава, Прага, Хельсінкі, Бялград і Варшава. Самай жа дарагой еўрапейскай сталіцай гэтай зімой прызнаны швейцарскі Берн. Тут двое сутак пражывання абыдуцца амаль у 200 долараў, авіябілет уляціць яшчэ ў 552,5 долара.

### Мінскае замчышча, пасля 2020 года

**3** Рэканструяваны музейна-турыстычны комплекс на месцы старажытнага Менска-Менеска на беразе Свіслачы напэўна стане адным з самых наведвальных турыстычных аб’ектаў. У яго падземным музеі можна будзе ўбачыць фрагменты старога драўлянага горада і маставых з бярвення. А пад адкрытым небам — ахоўныя валы, сцэны і вежы старажытнага гарадзішча. На беразе ракі з’явіцца скульптурная кампазіцыя “Бітва на Нямізе”, з якой у 1067 годзе і пачалася летапісная гісторыя горада.

### Хуткасны трамвай, 2020 год

**4** Развіццё атрымаюць не толькі хуткасныя электрычкі, якія ўжо працуюць у сталіцы, але і сетка пуцей для хуткаснага трамвая. Загарадныя лініі звяжуць горад з Нацыянальным аэрапортам “Мінск” — праз жылыя раёны Натынгем, Зялёны Бор і Сокал, размешчаныя за МКАД. Хуткасныя трамваі пойдуць у Лагойск, Бараўляны і ў зоны адпачынку “Астрашыцкі гарадок”, “Сілічы”, а таксама спарткомплекс “Раўбічы”.

### Ракаўскае прадмесце і Залатая Горка, 2020 год

**5** Нараўне з папулярнымі ў мінчан і гасцей горада турыстычнымі зонамі — архітэктурнымі брэндамі сталіцы Траецкім прадмесцем, Верхнім горадам і Лошыцкім сядзібна-паркавым комплексам, у абноўленым выглядзе перад турыстамі паўстануць старыя гарадскія кварталы — Ракаўскае прадмесце, Залатая Горка і Кальварыя.

# Наваселле на вяселле

## Жыллёвыя пазыкі пад нізкія працэнты. Але не на шкоду казне.

Беларускі "дабрабыт" — гэта не залатыя ўпрыгажэнні, не футры з собаляў, а ўласны дом. Бясплатнага жылля "па чарзе", як у савецкія часы, больш няма. Дзяржава падтрымлівае сваіх грамадзян у жаданні абзавесціся ўласнымі квадратнымі метрамі іншымі спосабамі. Але падтрымка не для ўсіх, а толькі для льготнікаў.

Нарадзіў трэцяга — можаш разлічваць на паляпшэнне жыллёвых умоў. Шматдзетным сем'ям прызначаны сур'ёзныя льготы. Мінчанін Павел Сасновіч, бацька дваіх сыноў і дачкі, змог перавезці сям'ю ў добрую трохпакаёвую кватэру.

— Калі чакалі дачку, пачалі высвятляць, як пашырыць жылплошчу. У 2012 годзе нам далі льготны крэдыт усяго пад адзін працэнт, гэта значыць практычна па сабекошце. Дзякуючы такой стаўцы расплаціліся з банкам за тры гады. Цяпер для дзяцей больш прасторы. У калідоры ў іх сапраўдная спартзала.

Сям'я Сасновічаў магла і не спяшацца аддаваць крэдыт, таму што ў Беларусі шматдзетным яго даюць на тэрмін да сарака гадоў.

Само сабою, ёсць і абмежаванні. Кватэру нельга прадаць яшчэ некалькі гадоў пасля пагашэння крэдыту. Для яго атрымання сям'я павінна стаяць на чарзе тых, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Банк пракрэдытуе не больш за дваццаць квадратных метраў жылплошчы на кожнага члена сям'і. Калі прэтэндуеш на кватэру ў Мінску, неабходна пражыць у сталіцы дзесяць гадоў.

— У 2015 годзе 9,8 тысячы шматдзетных сем'яў атрымалі фінансавую дапамогу ў пагашэнні запазычанасці па льготных крэдытах на будаўніцтва, рэканструкцыю або набыццё жылля, — паведаміла намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына Дудка.

Крэдыты шматдзетным выдае "Беларусбанк" ужо больш за пятнаццаць гадоў. У апошнія гады давялося "падціснуцца".

### БЮДЖЭТНАЕ ЖЫЛЛЁ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ СЕМ'ЯЎ

**1 млн. 610 тыс. м²**
жылля пабудавана з дзяржаўнай падтрымкай

**800 тыс. м²**
плануецца пабудаваць з дзяржаўнай падтрымкай да 2017 года

**790 бел. руб.**
прагназуемы кошт м² ільготнага жылля (каля 34% ад сярэдняга рыначнага кошту)

НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА




На цырымоніі адкрыцця інтэрната для медыцынскіх работнікаў па вуліцы Калеснікава ў Мінску. Навасёлы — сям'я Нарбін

Забяспечыць усіх, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жылля, ільготнымі крэдытнымі рэсурсамі дзяржава не можа. Перш за ўсё на будаўніцтва будуць накіроўвацца тыя сем'і, якія стаяць у чарзе звыш трох гадоў.

Першае каханне, прапанова рукі і сэрца, гучнае вяселле, а потым... туліцца разам з бацькамі? Для маладых сем'яў у Беларусі таксама ёсць асаблівыя прапановы. Умовы не такія прывабныя, як для шматдзетных, але ўсё роўна не кабальныя — выдаюць крэдыт пад пяць працэнтаў гадавых на тэрмін да дваццаці гадоў. Галоўная ўмова — хаця б адзін з маладых не павінен быць старэйшым за 31 год на момант жаніцьбы або нараджэння дзіцяці.

Каб атрымаць крэдыт, трэба дачакацца сваёй чаргі. Спісы складаюць мясцовыя ўлады. Даваць прагнозы, колькі часу давядзецца чакаць, чыноўнікі не бяруцца. Тут усё залежыць ад сітуацыі з эканомікай. У 2014 годзе купіць кватэры па льготнай схеме ўдалося 15,5 тысячы маладых сем'яў. Застаўся "хвост" яшчэ на трыста тысяч пар прэтэндэнтаў.

## Паспець за пяць гадоў

Дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, — асаблівая частка сацпалітыкі дзяржавы. Сіротам, якім споўнілася васямнаццаць, даюць у бясплатнае карыстанне кватэры на пяць гадоў. Уласнікамі прадастаўленага жылля стаць немагчыма, яно застаецца ў валоданні дзяржавы. Але затое можна яго выкупіць ці набыць іншае. Дзяржкрэдыт пад адзін працэнт на сорак гадоў дае магчымасць аплаціць трыццаць квадратных метраў. За лішні метраж прыйдзецца ўносіць суму па звычайных банкаўскіх працэнтах.

### Слова дэпутату

**Юрый Дарагакупец, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па жыллёвай палітыцы і будаўніцтве:**

*— Сёння атрымаць запаветныя метры і пры гэтым пальцам аб палец не ўдарыць не атрымаецца. Хочаш кватэру? Зарабі! Падтрымка дзяржавы — для сацыяльна неабароненых слаёў насельніцтва. Вырашыць кватэрнае пытанне дапамагаюць такім катэгорыям грамадзян, як інваліды, шматдзетныя сем'і, сіроты. Для іх ёсць пэўныя прывілеі: пазачарговае права на атрыманне льготнага крэдыту або субсідыі на будаўніцтва жылля.*

*Многія мараць жыць у сталіцы. Але ў нас актыўна добраўпарадкоўваюцца і развіваюцца гарады-спадарожнікі: Дзяржынск, Заслаўе, Лагойск. Там ствараецца выдатная інфраструктура. Адкрываюцца новыя прадпрыемствы, школы, бальніцы. Пабудаваць у невялікіх гарадах дом або кватэру прасцей і танней, чым у Мінску. Сёння 30-40 хвілін на маршрутцы — несур'ёзна нават. Рэкамендую ехаць туды. І чысцей, і льготы ад дзяржавы атрымаць прасцей.*




ЮРЫЙ МАЗАЛЕЎСКІ

# Хілтан вырас прыгожа

**Былая спадчынніца сямейнага бізнесу, буйнейшай у свеце сеткі гатэляў Hilton Hotels & Resorts, якой кіруе карпарацыя Hilton Worldwide, Пэрыс Хілтан ніколі не была ў Мінску. І не факт, што даедзе сюды. У адрозненне ад кіраўнікоў самай знакамітай гасцінічнай кампаніі. Яны нашу краіну ведаюць, бачаць тут вялікі інвестыцыйны патэнцыял і гатовыя адкрываць новыя гатэлі.**

Hilton

Для шырокай публікі чарговы прылёт у Мінск віцэ-прэзідэнта Hilton Worldwide ў Цэнтральнай і Паўночнай Еўропе Іахіма-Ян Шляйфера застаўся незаўважаным. Напярэдадні калядных святаў эксперт такога ўзроўню адклаў справы, каб у спакойнай, па-хатняму ўтульнай атмасферы перарэзаць чырвоную стужачку ў новым прэміяльным гатэлі Double Tree. У вузкім коле журналістаў на 21-м паверсе аднаго з самых знакамітых ужо бараў горада, пахруստваючы крэветачнымі чыпсамі, спадар Шляйфер (просіць называць сябе Джы-Джы) з натхненнем расказваў пра турыстычны патэнцыял горада і краіны ў цэлым. Гэта нядзіўна: з восені мінулага года карпарацыя адкрыла ў Мінску ўжо два аб'екты — гатэль верхняга эканом-сегмента Hampton і прэміяльны Double Tree. І на дасягнутым спыняцца не збіраецца.

— Так, цяпер сапраўды ёсць зніжэнне дзелавой актыўнасці, невялікі крызіс, але яго не параўнаць з тым, які быў у 2008 годзе. Цяперашні час вельмі добры для інвестыцый і ў Мінск, і ў Беларусь у цэлым. Я шмат падарожнічаю і бачу, як сюды заўсёды ляцяць поўныя самалёты: з Амстэрдама, з Вены, з іншых еўрапейскіх гарадоў. Гэта гаворыць пра тое, што ў вашага горада і краіны вельмі добры турыстычны патэнцыял.

Іахім-Ян Шляйфер:

***Я шмат падарожнічаю і бачу, як сюды заўсёды ляцяць поўныя самалёты: з Амстэрдама, з Вены, з іншых еўрапейскіх гарадоў. Гэта гаворыць пра тое, што ў вашага горада і краіны вельмі добры турыстычны патэнцыял***

Раней кіраўніцтва Hilton Worldwide планавала давесці запаўняльнасць новага аб'екта да 70 працэнтаў за тры гады, пазней прагноз знізіўся да 60 працэнтаў. Сёння знакаміты гатэльер не гаворыць пра канкрэтныя лічбы, тлумачачы, што яны залежаць ад шэрага фактараў. Але вось у чым ён абсалютна ўпэўнены, дык гэта ў тым, што папулярнасць Мінска будзе расці. Джы-Джы ўспамінае чэмпіянат свету па хакеі, які прайшоў у беларускай сталіцы, а таксама Еўрапейскія гульні, якія пройдуць у нас у 2019 годзе. Мерапрыемствы такога ўзроўню, упэўнены спадар Шляйфер, гавораць пра многае. У той жа час карпарацыя хацела б зрабіць стаўку менавіта на развіццё дзелавога турызму.



— Людзі прыязджаюць сюды на пэўнае мерапрыемства на 3-4 дні, але пакідаюць тут шмат грошай. Паверце, — запэўнівае Джы-Джы, — мы хочам зрабіць так, каб гэты гатэль меў свой нацыянальны беларускі дух і каларыт.

У цэлым рынак СНД і Усходняй Еўропы для Hilton Worldwide сёння ў прыярытэце. У бліжэйшы час колькасць гатэляў сеткі плануецца павялічыць з цяперашніх 28 да 52. На нашу краіну ў карпарацыі таксама ёсць пэўныя планы. Кіраўніцтва не выключае магчымасці адкрыцця новых брэндаў сеткі ў буйных гарадах. Больш за тое, лічыць гэта эканамічна мэтазгодным.

Галіна **Нііканава**




БЕЛТА

## Знайшлі рэзервы

**Зімовым снежаньскім вечарам у Мінск з Масквы ўпершыню прыляцеў "Стрыж". Так называецца хуткі 216-месны поезд, дабрацца якім ад нас у Берлін можна за 12 гадзін. На 4 гадзіны хутчэй, чым раней!**

Значна скараціць час у дарозе атрымалася за кошт праходжання беларуска-польскай мяжы, дакладней, хуткасці пераходу з каляі 1.520 мм на больш вузкую. "Пераабуўка" саставу, сфарміраванага з вагонаў Talgo, цяпер дзякуючы ўсталяванаму на станцыі Брэст сучаснаму пераходнаму механізму будзе ажыццяўляцца ў аўтаматычным рэжыме і замест 2 гадзін зойме ўсяго каля паўгадзіны. Прычым з улікам пагранічнага і мытнага кантролю.

Павысіць хуткасць дазволіла і наступная канструктыўная адметнасць саставу: за кошт асаблівай сістэмы нахілу кузава крывыя малога радыуса "Стрыж" будзе пралятаць значна хутчэй. Зрэшты, і 20 гадзін у дарозе (а менавіта столькі часу зойме цяпер дарога па маршруце Масква — Берлін), гаворыць намеснік генеральнага дырэктара расійскай Федэральнай пасажырскай кампаніі Аляксандр Пятрунін, гэта зусім не мяжа:

— Нягледзячы на тое што на гэтым участку Swift — поезд самы хуткасны, разганяецца ён можа і да 220 кіламетраў у гадзіну. Наша задача — падрыхтаваць пад такія хуткасці інфраструктуру.

Рэйсы ў Германію поезд будзе выконваць па суботах і нядзелях. З Оршы, Мінска і Брэста на ім можна будзе дабрацца і ў Варшаву, Познань, Жэпін і Франкфурт-на-Одэры.



# Спадчына інтэлекту

## Павага да кнігі, да ведаў і людзей навукі — адметнасць беларускага светаўспрымання

Пачаўся 2017 год, які ў Беларусі аб'яўлены Годам навукі. Ёсць добрая нагода паразважаць: ці аказаў 1517-ы істотны ўплыў на развіццё беларускага грамадства, гісторыю Беларусі ў шырокім сэнсе слова?

Не сакрэт: шлях да ведаў, у тым ліку і ў навуку для кожнага, хто мае схільнасць да вучэння, пачынаецца з кніг. А першыя згадкі пра рукапісныя кнігі, асветніцтва для беларусаў звязаны як з Тураўскім Евангеллем XI стагоддзя (ацалелі яго аркушы-фрагменты), так і з імем Еўфрасінні Полацкай. Мяркуюць, нарадзілася яна прыкладна ў 1110 годзе. Гэта — нябесная апякунка Бацькаўшчыны, першая жанчына-святая на ўсходнеславянскіх землях. Полацкая князёўна Прадслава ў 12-гадовым узросце сышла ў манастыр, стала інакіняй Еўфрасінняй. Жыла спачатку ў келлі пры Сафійскім саборы, дзе вольны ад малітваў час "прысвячала перапісванню свяшчэнных кніг" — гэта з сучаснага буклета з Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра. Прыкладна каля 1125 года заснавала новы манастыр — ён рос пры невялічкай драўлянай царкве Спаса. Ігуменя Еўфрасіння займалася ў горадзе Полацку, кажучы сучаснаю мовай, рознымі праектамі, у тым ліку й адукацыйнымі: пашырэнне ведаў, перапісванне кніг. Напрыканцы жыцця здзейсніла паломніцтва ў Святую зямлю, да Гроба Гасподня. У Ерусаліме й завяршыўся ў 1173 годзе яе зямны шлях. Прападобную Еўфрасінню ўшаноўваюць праваслаўныя па ўсім свеце, прызнае яе святою і каталіцкая царква, хоць, як вядома, разыходзіцца цэрквы пачалі да нараджэння Прадславы, раней за 1054 год. Вось які даўні, прыгожы, высокі прыклад паважлівага стаўлення да кнігі, да ведаў мы маем.

1517-ы знакавы ў беларускай гісторыі. Сёлета па свеце будзе адзначацца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, у тым ліку і па лініі ЮНЕСКА. Ураджэнец Полацка, беларускі першадрукар і асветнік Францыск Скарына тры гады (1517-1519) напружана працаваў, выдаючы ў чэшскай Празе 22 кнігі Святога Пісання на старажытнай беларускай мове. Дарэчы, мова тая была царкоўнаславянскаю, з вялікай колькасцю слоў беларускіх, на першы погляд яна падаецца рускаю. Ды й адна з кніг, выдадзеных першадрукаром, — "Бивлия руска", і прадмову доктар Францыск Скарына з Полацка піша "во всю бивлию рускаго языка". Аднак даследчыкі ўдакладняюць: сучасныя рускія на той час называліся маскавітамі. Таму, каб не блытацца ў тэрмінах, вучоныя прапануюць ужываць у даследаваннях, навуковых дыскусіях і паведамленнях, артыкулах пра 500-гадовую даўніну вызначэнне: "Русінская Біблія".

Сапраўды, на доўгім гістарычным шляху да назвы "беларусы" як толькі нашых продкаў не называлі. У скарынаўскія часы — і русінамі (па нацыянальнасці), і ліцьвінамі (па грамадзянстве ў Вялікім Княстве Літоўскім). Навукоўцы звяртаюць увагу: русінам называў сябе й сам Скарына ў час экзаменаў у Падуанскім універсітэце — гэта зафіксавана ў дакументах 1510 года. Пазней такое вызначэнне выкарыстоўваў і Карл Маркс. Русін — ад слова Русь. А першае вядомае згадванне аднаго з вядомых цяпер нашых тэрытарыяльна-этнічных найменняў "Белая Русь" у пісьмовай (лацінамоўнай) крыніцы (там напісана: Alba Ruscia) даследчыкі адшукалі ў дакументах за

1217 год. І таму ўжо мэтазгодна падумаць пра 800-гадовы юбілей. Яшчэ б копію з таго дакумента ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі перадаць бы, і свету абвясціць пра глыбокія карані наймення Alba Ruscia/Белая Русь. А заадно расказаць і пра нашых продкаў русінаў з Вялікага Княства Літоўскага: каб не блытаць іх з цяперашнімі рускімі з Расійскай Федэрацыі. Бо Францыск Скарына — не рускі асветнік, а грамадзянін ВКЛ. Больш за тое, у інтэрнэце знаходзім: "Гуманіста, прадстаўніка еўрапейскай культуры Францішка Скарыну ў Маскве абвінавацілі ў ерасі, спалілі яго кнігі, а сам ён вымушаны быў ратавацца ўцёкамі"...

У савецкія часы існавала думка, быццам гісторыя Беларусі пачалася толькі з 1917 года. Быццам раней тут былі лапці, балоты ды бедная доля мужыка-беларуса... Шматлікія палацы, старажытныя замкі, храмы, курганы, а таксама Слуцкія паясы, старадаўнія рукапісныя і друкаваныя кнігі, што сведчаць пра даўнюю, тысячагадовую гісторыю высокакультурнага жыцця на Беларусі, пра драматычную, а нярэдка й трагічную гісторыю змагання людзей яе за права жыць і "людзьмі звацца" — усё гэта заставалася чамусьці ўбаку.

Калі нядаўна я з калегам спрабаваў весці дыялог пра даўнюю гісторыю беларускай навукі, культуры, то пачуў: ну якая гісторыя, калі Беларуская акадэмія навук утворана толькі ў 1928 годзе. Але ж Францыск Скарына, даводзіў я, быў доктарам медыцынскіх навук, і адпаведны экзамен на такое званне паспяхова здаў у Падуанскім універсітэце ў 1512-м... Я мог бы дадаць: і ў XV стагоддзі маладыя людзі з Вялікага Княства Літоўскага ездзілі вучыцца ў Кракаўскі, Пражскі, Лейпцыгскі, Балонскі ды іншыя вядомыя універсітэты Еўропы. Шмат можна сказаць і пра Віленскі ўніверсітэт, у якім пазней вучыліся многія нашы землякі... Зрэшты, хай кожны адкрывае для сябе такія "прапісныя ісціны" сам. Цяпер хапае крыніц інфармацыі, каб разважаць, рабіць правільныя высновы — было б толькі жаданне карыстацца фактамі.


ВІТАЛІЙ ПІВАВАРЧЫК

Жывое сведчанне таго, з якой павагай у народзе ставяцца да людзей вучоных, лёгка знайсці ў каштоўным навуковым выданні "Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы" (1992), амаль на 500 старонак. Руплівы даследчык і збіральнік твораў народнай мудрасці Фёдар Янкоўскі выдзеліў у кнізе нават асобны раздзел "Розум, навука, вучэнне". Вось некаторыя залацінкі адтуль: "Бачыць вока далёка, а розум яшчэ далей", "Вучыся замаладу, то на старасць як знойдзеш", "Вучыцца заўсёды згадзіцца", "З разумным пагавары — розуму набярэшся, а з дурнем — і апошні страціш", "Лепей з разумным згубіць, як з дурнем знайсці", "Навука хоць памучыць, але жыць навучыць", "Навука — лепшае багацце", "Розум не сякера — не пазычыш"...

Апошнім выслоўем, дарэчы, можна прыгожа патлумачыць: чаму ў Беларусі ў пасляваенны час выраслі буйныя машынабудаўнічыя прадпрыемствы: Мінскі трактарны завод і Мінскі аўтамабільны завод. Трэба было ставіць іх, кажучы сучаснаю моваю, на тэрыторыі з высокім індэксам чалавечага развіцця, у "гістарычна разумным месцы". Бо, як вядома, складаныя вытворчасці патрабуюць кваліфікаванай рабочай сілы, не абысціся там і без саліднай навуковай падтрымкі. Пазней у Беларусі былі створаны буйныя навукаёмкія вытворчасці з брэндамі "Інтэграл", "Гарызонт", а таксама Беларускае оптыка-механічнае аб'яднанне, БелАЗ ды многія іншыя.

Згадаем: індэкс чалавечага развіцця (ІЧР) — гэта комплексны параўнальны паказчык-прагноз па працягласці жыцця, пісьменнасці, адукаванасці ды ўзроўні жыцця для краін у свеце. Беларусь цяпер — першая ў спісе краін з "высокім ІЧР", і ёсць усе падставы ў бліжэйшы час перайсці ў спіс "вельмі высокага ІЧР". Мы на 50-м месцы сярод амаль 190 краін.

Што вызначае развіццё беларускай навукі сёння? Як вядома, у Беларусі традыцыйна моцная школа вышэйшай матэматыкі. І сапраўды, "розум не сякера — не пазычыш"... І калі пачалі бурна развівацца камп'ютарныя тэхналогіі, у краіне параўнальна лёгка было наладзіць падрыхтоўку інжынераў-праграмістаў. Прафесіяналаў, якія кацірующца ў свеце, некаторыя і працуюць у замежжы. Каб больш эфектыўна выкарыстоўваць свой інтэлектуальны капітал, Беларусь стварыла ў 2005-м Парк высокіх тэхналогій. На яго сайце чытаем: больш за 90% выробленага ў ПВТ праграмнага забеспячэння ідзе на экспарт. Пры тым амаль 47% — у краіны Еўропы, звыш 40% — у ЗША і Канаду, больш за 10% — у Расію і СНД. Дарэчы, і анлайн-гульня "Свет танкаў", у якой 145 мільёнаў карыстальнікаў па свеце, нарадзілася ў Беларусі. Самая прыбытковая гульнёвая кампанія Wargaming, што яе стварыла, і цяпер базуецца ў Мінску.

На пустым месцы, агульнавядома, нічога не вырасце. І беларусы, паважаючы традыцыі Еўфрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, маюць павагу да кнігі, да ведаў, да вучонасці. Гэта ў маіх суродзічах, мяркую, у генах. З тых каранёў і расце наш інтэлектуальны капітал. І ў Год навукі рэдакцыя плануе расказваць пра цікавыя навуковыя праекты, распрацоўкі беларускіх вучоных.

Іван **Ждановіч**

# Рэйтынг, у якім Беларусь выглядае вельмі тэхналагічна

**Беларусь — безумоўны лідар у развіцці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у СНД. Гэта выснова штогадовай справаздачы “Вымярэнне інфармацыйнага грамадства” Міжнароднага саюза электрасувязі, які ацэньвае індэкс ІКТ у 175 краінах адразу па 11 паказчыках. Ад спецыфічных тэхналагічных крытэрыяў да колькасці абанентаў мабільнай сувязі або актыўных карыстальнікаў інтэрнэту. Цяпер у агульнасусветным рэйтынгу мы занялі 31-е месца з індэксам развіцця ІКТ 7,26. Але ж яшчэ ў 2008-м знаходзіліся на 84-й пазіцыі... Бліжэйшы канкурэнт па СНД Расія цяпер прыкметна адстае — у яе 43-ці радок.**

Шмат у чым упэўнены рост краіны ў гэтым міжнародным рэйтынгу звязаны з тым, што напрамку надаецца пільная ўвага на самым высокім узроўні, лічыць дэкан факультэта камп’ютарных сістэм і сетак БДУІР, кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Валерый Прыткоў:

## ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ГРАМАДСТВА-2016

**Беларусь лідзіруе ў глабальным рэйтынгу развіцця інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій на постсавецкай прасторы**




Дадзеныя знаходзяцца ў новым дакладзе Міжнароднага саюза электрасувязі “Вымярэнне інфармацыйнага грамадства 2016”. Міжнародны саюз электрасувязі (International TelecommunicationUnion, ITU) — спецыялізаванае падраздзяленне ААН, якое вызначае стандарты ў галіне ІКТ, у тым ліку ў сферы тэлекамунікацый і радыё. Індэкс развіцця ІКТ распрацаваны на аснове 11 паказчыкаў, якія датычацца доступу да ІКТ, выкарыстання ІКТ, а таксама практычнага ведання гэтых тэхналогій насельніцтвам.

— Вельмі аптымістычнымі тэмпамі развіваюцца і Парк высокіх тэхналогій, і паслугі ў сферы прадастаўлення доступу да IT. Са свайго боку як факультэт, які рыхтуе кадры ў гэтай галіне, мы вельмі цесна інтэгруем адукацыйныя праграмы з практыкай. Створаны філіялы на базе IT-кампаній, некалькі навучальных цэнтраў сусветных вытворцаў камп’ютарнага абсталявання і праграмнага забеспячэння, напрыклад, Cisco, IBM, NVidia. Праводзім падрыхтоўку па іх тэхналогіях і выдаём студэнтам сертыфікаты міжнароднага ўзору. Развіваецца і алімпіядны рух — два гады запар нашы каманды выходзілі ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні ACM ICPC. У апошнім мы занялі 17-е месца, а ў 2012 годзе прывезлі бронзавыя медалі — выдатны вынік, улічваючы, што толькі ў фінале выступала 128 каманд, а ўсяго ў адборачных турах іх было больш за 13.000. Праводзім на базе факультэта і алімпіяды сваімі сіламі. Якраз у гэтыя дні праходзіць чарговая, прысвечаная прыкладным напрамкам — базам дадзеных, адмініграванню Linux, праграмаванню 1C... Трэба сказаць, цяпер прыходзяць вельмі матываваныя маладыя людзі, а прахадныя балы на некаторыя спецыяльнасці на факультэце ў апошнія гады не апускаюцца ніжэй за 360.

Дарэчы, Беларусь адзначана і як краіна з даступным коштам шырокапалоснага інтэрнэту — 7,2 долара, хоць у сярэднім на планеце абаненцкая плата даходзіць да 40 долараў. А згодна з іншым даследаваннем Connected Consumer Survey, праведзеным па заказе Google, лідары мы таксама па колькасці актыўных карыстальнікаў інтэрнэту — 91 працэнт падключаных да сеткі заходзіць у яе штодня. Не адстае і старэйшае пакаленне. 78 працэнтаў з тых, каму за 55, карыстаюцца інтэрнэтам і ў асабістых, не звязаных з работай мэтах. Гэта ўзровень Даніі або Фінляндыі. Па колькасці ж абанентаў шырокапалоснай сувязі — 31,35 на 100 жыхароў — мы займаем 23-е месца ў свеце, па суседстве з ЗША і Грэцыяй. Чакаецца, што да 2020 года гэты паказчык павялічыцца ў краіне да 34,7 на 100 жыхароў.

Антон **Касцюкевіч**



БЕЛТА

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл Мясніковіч падчас наведвання эксперыментальнага ўчастка па выдзяленні чалавечага лактаферыну з малака трансгенных коз

*На лініі ў Інстытуце мікрабіялогіі будуць выпускаць субстанцыю, пачынаючы ад 5 кг у год — гэтага хопіць для вытворчасці БАДаў для 2.000 чалавек. Сусветная патрэбнасць у лактаферыне — 90 тон у год*

# Лінія працуе на здароўе

**Чалавечы лактаферын з малака трансгенных коз дайшоў да стадыі вытворчасці. У Інстытуце мікрабіялогіі НАН адкрылі лабараторна-эксперыментальны ўчастак па яго выдзяленні, ачыстцы і сушцы.**

Гэта вялікі прарыў, хоць гаворка пакуль ідзе не пра прамысловыя маштабы, а пра доследныя. Бо да нядаўняга часу лёс унікальнага бялку, атрыманага беларускімі і расійскімі навукоўцамі падчас маштабных і дарагіх саюзных праграм “Белрастрансген” і “Белрастрансген-2”, быў туманны.

Чалавечы лактаферын утрымліваецца ў жаночым малацэ, гэта элемент сістэмы прыроджанага імунітэту. Яго здольнасці велізарныя: змагаецца з бактэрыямі і вірусамі, затармоўвае ракавыя пухліны, супрацьстаіць запаленням, узроставым парушэнням, мае антыаксідантныя і рэгенератыўныя ўласцівасці. Праблему зыходнага матэрыялу для яго выдзялення вырашыў створаны ў навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па жывёлагадоўлі статак трансгенных коз, у малацэ якіх змяшчаецца чалавечы бялок. Аднак малако даводзілася замарожваць на запас, яго проста не было дзе перапрацоўваць. Лінія ў Вялікім Ноўгарадзе, здольная справіцца з тонай такой сыравіны ў суткі, прастойвае. Прычынай таму і ў цэлым цяжкасцяў пашырэння кампанента на ўзроўні Саюзнай дзяржавы стала ўзмацненне расійскага заканадаўства пра ГМА, пад якое фармальна трапіў гэты рэкамбінантны бялок.



Цяпер праекты з лактаферынам уключаны ў беларускія дзяржпраграмы. На лініі ў Інстытуце мікрабіялогіі будуць выпускаць субстанцыю, пачынаючы ад 5 кг у год — гэтага хопіць для вытворчасці БАДаў для 2.000 чалавек. Першымі заказчыкамі сталі інстытуты акадэміі, якія хочуць атрымаць бялок для даследаванняў. Лактаферын можна выкарыстоўваць у дзіцячым, спартыўным, дыетычным харчаванні, фармацэўтычнай, касметычнай прадукцыі. Сусветная патрэбнасць у ім — 90 тон у год.

Юлія **Васільева**



БЕЛТА

# Зразумець чужы боль

## Тэрмін "паліятыўная дапамога" не вельмі даўно замацаваны заканадаўча, але ўжо трывала ўвайшоў у медыцынскую практыку

Вялікі крок наперад бясспрэчна зроблены. Тут трэба разумець, што гэтае паняцце ўключае ў сябе не толькі медыцынскую, але і псіхалагічную, сацыяльную, духоўную падтрымку. Новыя падыходы да вырашэння пытання ўсё часцей абмяркоўваюць і на дзяржаўным узроўні, і ў грамадстве, асабліва калі справа датычыцца дзяцей. Бо калі хваробу нельга вылечыць, гэта зусім не значыць, што маленькім пацыентам нельга дапамагчы. Пытанне аказалася ў цэнтры ўвагі і на чарговым пасяджэнні Нацыянальнай камісіі па правах дзіцяці.

— У нас у краіне 892 дзіцяці ўключаны ў рэгістр тых, хто мае патрэбу ў аказанні паліятыўнай дапамогі, — гаворыць намеснік Прэм'ер-міністра Наталля Качанава. — Большасць з іх знаходзяцца ў сям'і і атрымліваюць дапамогу дома. Яна асаблівая, але многія бацькі хочуць даглядаць сваё дзіця самастойна. І сёння выбудавана дакладная сістэма навучання і іх, і персаналу, каб падтрымліваць сям'ю на ўсіх этапах.

Дарэчы, і ў наступныя гады, паводле слоў Наталлі Качанавай, акцэнт будзе зроблены на спецыяльнай падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы ўсіх работнікаў, задзейнічаных у гэтай сферы. Першы намеснік Міністра аховы здароўя Дзмітрый Піневіч падкрэслівае: больш за 80 працэнтаў дзяцей у нас атрымліваюць паліятыўную дапамогу менавіта дома, у асяроддзі родных. Гэта найбольш прымальны варыянт, перш за ўсё для самой сям'і. Таму яна мае патрэбу ў яшчэ большай увазе і падтрымцы. Бо важна, каб дзіця да апошніх дзён заставалася з любячымі людзьмі.

Цяпер да такіх дзяцей, нават з самых аддаленых рэгіёнаў, падыходзяць індывідуальна, ствараючы на месцах усе ўмовы для якаснага догляду. У стацыянарах ёсць ложкі для аказання дапамогі, а ўзровень спецыяльных устаноў расце год ад году. Прыклад таму — мінскі дом дзіцяці № 1 для дзяцей з арганічным пашкоджаннем цэнтральнай нервовай сістэмы і псіхікі, дзе ёсць палаты паліятыўнай дапамогі. З 2002 года тут апякуюць сем'і, чыім дзецям асабліва патрэбна медыцынская падтрымка. У чатырох палатах могуць знаходзіцца 25 малышоў, у тым ліку і на апаратах штучнай вентыляцыі лёгкіх. Што характэрна, усе дзеці, хто атрымлівае сёння там неабходную часовую дапамогу, маюць любячую сям'ю. Бацькі ад іх не адвярнуліся, многія ўжо рыхтуюцца да таго, каб забраць іх дадому, і праходзяць неабходнае для гэтага навучанне. Цяпер сем'і трэба толькі падтрымаць. І галоўнае тут — узаемадзеянне ўсіх службаў і арганізацый.

Вольга **Савіцкая**

# Кожнаму пацыенту — асабісты кабінет

**65 мільёнаў долараў на глабальную інфарматызацыю беларускай медыцыны вылучае Сусветны банк, аддаючы належнае ўжо дасягнутым у краіне поспехам**

Сам пераход на электронныя рэйкі пачаўся ў нас яшчэ 10 гадоў назад. Але калі ў Мінску працэс ідзе вельмі актыўна, прырастаючы навацыямі накшталт электроннага рэцэпта ці электроннай чаргі, то ў рэгіёнах — са скрыпам, з-за часам недастатковага фінансавага забеспячэння. Таму, паводле слоў Сямёна Палякова, кіраўніка аддзела арганізацыйна-метадычнага і сістэмна-тэхнічнага суправаджэння інфарматызацыі аховы здароўя Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра медыцынскіх тэхналогій, інфарматызацыі, кіравання і эканомікі аховы здароўя, вырашана ў першую чаргу дапамагчы тым, хто адстае, — абласцям, асабліва іх першаснаму звяну. Спісы ўдзельнікаў праекта ўжо сфарміраваны. У выніку да 2021 года як мінімум 70 працэнтаў медустаноў уключацца ў сістэму электроннай аховы здароўя на ўсе сто. Вынікам усеагульнай інфарматызацыі стане зусім не флэшка з электроннай амбулаторнай карткай у кожнага на руках, як можа здацца абывацелю. Бярыце вышэй: будзе створана адзіная цэнтральная інфармацыйная платформа, вялікі сервер, які акумулюе ўсё. Скажам, медыцынскія дадзеныя па любым з нас, ад групы крыві да выпісак аб праведзеным лячэнні. Сэрвісы электроннага рэцэпта, электроннага запісу да ўрача плюс цалкам новы — асабісты кабінет пацыента, дзе кожны будзе мець неабходны анлайн-доступ да інфармацыі пра сябе і магчымасць зваротнай сувязі. Плануецца, што ў стварэнні гэтага ўнікальнага інфармацыйнага сховішча будуць у тым ліку задзейнічаны распрацоўшчыкі і расійскія, і з далёкага замежжа. Бо па такім шляху рухаюцца ў многіх краінах. Скажам, у Эстоніі ўжо 99 працэнтаў рэцэптаў — электронныя.

Зрэшты, медыкі лічаць, што магчымасць выпісаць лякарства на паперы павінна заставацца заўсёды, на ўсякі пажарны. А ў Мінску, хоць пацыентаў і заклікалі атрымаць карткі электронных рэцэптаў да 1 студзеня, дубліраваць іх звычайнымі будуць яшчэ дакладна год. Дарэчы, у паліклініках на лічбавы носьбіт падгружаюць усё новыя і новыя функцыі: пры дапамозе ўнікальнага штрыхкода можна запісацца дыстанцыйна да ўрача ці выклікаць яго дадому...




Людміла **Кірылава**



# Тэхналогіі мяняюць форму

**Біяметрычныя пашпарты і нацыянальныя ID-карты з'явяцца ў канцы 2018 года**

Пра гэта паведаміў начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Аляксей Бягун:

— Плануецца, што ў канцы 2018 года мы ўжо атрымаем біяметрычны пашпарт для выезду за мяжу і IDкарту.

У адпаведнасці з планам па асваенні біяметрычных тэхналогій у перыяд з 2014 па 2018 год у краіне праводзіцца комплекс мерапрыемстваў па ўкараненні біяметрычных тэхналогій у нацыянальныя дакументы. Гэта пашпарт для выезду за мяжу і нацыянальная IDкарта. Плануецца іх укараненне ў беларускую інтэграваную сэрвіснаразліковую сістэму.

IDкарты — гэта пластыкавыя карткі з біяметрычнай інфармацыяй, запісанай на чыпе. Яны паспяхова прымяняюцца ў многіх краінах свету. Такія карты кампактныя і зносастойкія. Галоўная іх перавага ў тым, што іх практычна немагчыма падрабіць. Выкарыстанне біяметрычных замежных пашпартоў дае магчымасць перасякаць мяжу іншых дзяржаў больш хутка і камфортна.

Аляксей **Фядосаў**

# Сябры збіраюцца разам

**Што такое інклюзія? Ці дасягнула Беларусь Мэт устойлівага развіцця? Як пераадолець бар'еры на шляху да дасягнення роўнасці ўсіх уразлівых груп насельніцтва? Адказаць на гэтыя няпростыя пытанні імкнуліся арганізатары і ўдзельнікі рэгіянальнай кампаніі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый "Інклюзіўная Беларусь". У мінулым, снежаньскім нумары часопіса ўжо была публікацыя на гэтую тэму. Мы расказвалі, як удзельнікі кампаніі "Інклюзіўная Беларусь" праехалі з Мінска па абласных цэнтрах Брэста і Гродна. Сёння — працяг маршруту: Гомель — Магілёў — Віцебск.**

## Трэці горад на шляху

Гомель стаў трэцім горадам Беларусі, які падключыўся да правядзення рэгіянальнай кампаніі "Інклюзіўная Беларусь: не пакідаючы нікога ўбаку ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця". Мерапрыемствы кампаніі прайшлі на розных пляцоўках абласнога цэнтра, асноўнай з якіх стаў Гарадскі цэнтр культуры, дзе адбылася афіцыйная цырымонія адкрыцця з удзелам прадстаўнікоў агенцтваў сістэмы ААН і мясцовых органаў улады.

"Устойлівае развіццё — гэта той арыенцір, тая перспектыва, да якіх рухаецца чалавецтва, — сказаў на афіцыйнай цырымоніі адкрыцця кампаніі намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Прывалаў. — Мы рады, што праз год пасля кампаніі "Экспрэс ААН-70", у Гомелі зноў сабраліся міжнародныя эксперты, прадстаўнікі дзяржаўных органаў і няўрадавых арганізацый, каб абмеркаваць адну з важнейшых Мэт устойлівага развіцця".

Гэтую думку прадоўжыў Кіраўнік Прадстаўніцтва Міжнароднай арганізацыі па міграцыі ў Беларусі Зейнал Гаджыеў: "Правядзенне кампаніі "Інклюзіўная Беларусь" з'яўляецца лагічным працягам місіі "Экспрэс ААН-70" і падкрэслівае нашу прыхільнасць Мэтам устойлівага развіцця, якія сёння мы ажыццяўляем на практыцы".

Прадстаўнік Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у Беларусі Жан Іў Бушардзі адзначыў, што Гомельская вобласць падпала пад вялікі ўплыў крызісу бежанцаў з Украіны і Сірыі і стала выдатным прыкладам беларускай гасціннасці ў адносінах да перамешчаных асоб. "Наведайце мерапрыемствы кампаніі, паглядзіце выставу і падумайце, як інклюзія можа ратаваць чалавечыя жыцці", — сказаў Жан Іў Бушардзі.

У рамках кампаніі Праграма развіцця ААН сумесна з партнёрамі традыцыйна шырока прадставіла вынікі сваёй дзейнасці па дасягненні краінай Мэт устойлівага развіцця да 2030 года з асаблівым акцэнтам на Мэту №10.

Сумесна з Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававых даследаванняў праект ПРААН "Развіццё інклюзіўнага мясцовага кіравання ў Рэспубліцы Беларусь" правёў семінар для прадстаўнікоў рэгіянальных органаў улады, дзе былі прадстаўлены лепшыя міжнародныя практыкі па ўкараненні прынцыпаў інклюзіі ў дзяржаўную службу, якая ў большай ступені будзе рэагаваць на існуючыя патрэбы насельніцтва.

У Гомельскай навукова-тэхнічнай бібліятэцы адбылося некалькі мерапрыемстваў на тэму пабудовы інклюзіўнага грамадства. Прэс-клуб па пытаннях стварэння безбар'ернага асяроддзя быў прысвечаны вызначэнню ролі медыя ў трансфармацыі гарадскога асяроддзя і грамадскай свядомасці насустрач уразлівым групам людзей, а таксама магчымасці фарміравання іх пазітыўнага вобраза праз СМІ.

Вэбінар "Адукацыя — інклюзія — устойлівае развіццё: досвед і рэсурсы ўзаемадзеяння ў рэгіёнах" сабраў за круглым сталом прадстаўнікоў адукацыйных устаноў Гомеля і Гомельскай вобласці, а таксама вучняў і настаўнікаў гімназіі №19 г. Мінска.




Пастаянны каардынатар ААН у Беларусі Санака Самарасінха адкрывае кампанію "Інклюзіўная Беларусь" у Віцебску

Удзельнікі сустрэчы дзяліліся назапашаным досведам і прыкладамі сваіх інклюзіўных адукацыйных практык. Першы "А" клас сярэдняй школы №5 Гомеля стаў адным з сямі эксперыментальных інклюзіўных класаў, дзе разам са здаровымі дзецьмі вучацца дзеці з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. А госці з Мінска прадставілі шэраг сацыяльных праектаў, ініцыяваных і створаных навучэнцамі.

Спартыўная частка кампаніі "Інклюзіўная Беларусь" у Гомелі была прадстаўлена сумесным мерапрыемствам ПРААН і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь. Цэнтрам інклюзіўнага спорту і пашырэння здаровага ладу жыцця стаў Ліцэй пры Гомельскім інжынерным інстытуце МНС. Выхаванцы ліцэя і навучэнцы з парушэннямі слыху са школы №70 Гомеля змагаліся ў розных эстафетах, міні-чэмпіянаце па тэнісе ўсляпую, перацягванні каната. Свае сілы маладыя людзі таксама выпрабавалі ў басейне. Інструктаваў юных плыўцоў Уладзімір Ізотаў, які выйграў залаты медаль на Параалімпійскіх гульнях-2016 у Рыа-дэ-Жанейра.

У рамках кампаніі "Інклюзіўная Беларусь" была праведзена сустрэча-дыялог грамадзянскага

**Суполка рома**

***Вольга Нячаева, кіраўнік арганізацыі дыяспары рома па Гомелі і Гомельскай вобласці:*** *"Нашай арганізацыі ўсяго 3 гады, але мы ўжо рэалізуем сумесныя з іншымі праекты. Наша мэта — гэта нефармальная адукацыя для дарослых сярод суполкі рома, садзейнічанне палавому выхаванню, працаўладкаванню, захаванню культурных традыцый. Цяпер у нас стартаваў новы праект "Адукацыя рома — погляд у будучыню", дзе задзейнічана 4 групы людзей гэтай суполкі: гэта школьнікі, дашкольнікі, бацькі, а таксама нефармальная адукацыя для дарослых — для таго каб выкараніць у суполцы непісьменнасць. Будуць арганізаваны курсы камп'ютарнай пісьменнасці і курсы прадпрымальніцтва  для таго, каб дарослыя рома маглі далей вучыць сваіх дзяцей, імкнуцца да лепшага, стаць паўнацэннымі грамадзянамі Беларусі. Галоўная праблема — непісьменнасць дарослых рома. З-за гэтага яны не могуць працаўладкавацца, у іх няма дакументаў, няма элементарнага пасведчання аб нараджэнні. Мы спрабуем неяк заявіць пазітыўна пра суполку. Цяпер рома стала намнога прасцей ажыццяўляць неабходныя адміністрацыйныя працэдуры".*






Спартыўная частка кампаніі "Інклюзіўная Беларусь" у Гомелі была прадстаўлена сумесным мерапрыемствам ПРААН і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Рэспублікі Беларусь

***Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года быў адобраны кіраўнікамі дзяржаў і ўрадаў свету, уключаючы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнку, 25-27 верасня 2015 года на саміце ААН па ўстойлівым развіцці ў Нью-Ёрку***



Насычаная праграма кампаніі "Інклюзіўная Беларусь" у Гомелі завяршылася канцэртам

грамадства па ўдзеле ў рабоце Краінавага каардынацыйнага камітэта па ўзаемадзеянні з Глабальным фондам для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі прафілактычныя праграмы па ВІЧ і сухотах, якія будуць падтрыманы са сродкаў Глабальнага фонду. Адбылася дыскусія аб ролі прадстаўнікоў грамадзянскага грамадства ў фарміраванні і падтрыманні прыхільнасці да лячэння ВІЧ-інфекцыі і туберкулёзу.

Экспазіцыя праекта ЕС-ПРААН "Развіццё на мясцовым узроўні" расказала пра ініцыятывы, якія рэалізуюцца ў Гомельскай вобласці. У прыватнасці, мясцовая ініцыятыва "Сувеніры Лоеўскага краю" аказвае садзейнічанне ў працаўладкаванні маладых людзей з інваліднасцю ва ўзросце ад 18 да 31 года. Ініцыятыва "Мы выбіраем жыццё" матывуе маладых людзей да вядзення здаровага ладу жыцця і адмове ад прымянення псіхаактыўных рэчываў. А тыя, хто ўжо трапіў у нарказалежнасць, атрымліваюць дапамогу ў пошуку магчымых шляхоў выхаду з яе.

На экспазіцыі, прадстаўленай Беларускім дзіцячым хоспісам, можна было навучыцца майстраваць з паперы буслоў шчасця, а галоўнае прыняць удзел у дабрачыннай кампаніі #БуселДом і ўнесці ахвяраванне для пабудовы летняга доміка для валанцёраў у летнім цэнтры хоспіса.

Зрабіць ахвяраванні для Беларускага дзіцячага хоспіса можна было і на вячэрнім інклюзіўным канцэрце, якім завяршалася насычаная праграма кампаніі "Інклюзіўная Беларусь" у Гомелі. Гледачоў усхвалявала выступленне бежанца з Сірыі Махера, які звярнуўся да залы з чуллівай прамовай аб важнасці кампаніі "Інклюзіўная Беларусь". Махер страціў на вайне сваіх родных і блізкіх, але здабыў новы дом і новае жыццё ў Беларусі.

У канцэрце прынялі ўдзел Саша Нема, UZARI, хор кінашколы "Дзіцячы кінапрадакшн", Гомельскі духавы аркестр пагранічных сіл Рэспублікі Беларусь.

## Магілёў прыняў эстафету

2 снежня ўдзельнікі кампаніі “Інклюзіўная Беларусь” наведалі абласны цэнтр Магілёў. Гарадскі Лядовы палац стаў цэнтральнай пляцоўкай мерапрыемстваў.

Ва ўрачыстай цырымоніі адкрыцця магілёўскай часткі кампаніі прынялі ўдзел намеснік старшыні Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта Валерый Малашка, намеснік прадстаўніка Фонду ААН у галіне народанасельніцтва Алена Касько, Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германіі ў Рэспубліцы Беларусь Петэр Дэтмар.

ПРААН сумесна з партнёрамі прадставіла магілёўцам насычаную і разнастайную праграму мерапрыемстваў, прысвечаную дасягненню краінай Мэт устойлівага развіцця-2030 з асаблівым акцэнтам на Мэту №10 (памяншэнне няроўнасці). Наведвальнікам было прапанавана азнаёміцца з актуальнымі напрамкамі дзейнасці ПРААН у рамках выставы праектаў і ініцыятыў, а таксама задаць пытанні спецыялістам і экспертам праектаў ПРААН. Праверыць веды на тэму Мэт устойлівага развіцця і атрымаць прызы з сімволікай арганізацыі можна было падчас серыі тэматычных віктарын, якія вёў вядомы беларускі шоўмен Яўген Булка.

Тэма пашырэння здаровага ладу жыцця стала візітнай карткай “Інклюзіўнай Беларусі” ў Магілёве. Знамянальнай падзеяй дня ў гэтым плане стала цырымонія ўрачыстага ўзнагароджання пераможцаў І-га конкурсу мясцовых ініцыятыў па пашырэнні здаровага ладу жыцця і прафілактыцы неінфекцыйных захворванняў. Конкурс праходзіў у рамках новай маштабнай ініцыятывы “Прафілактыка неінфекцыйных захворванняў, пашырэнне здаровага ладу жыцця і падтрымка мадэрнізацыі сістэмы аховы здароўя ў Рэспубліцы Беларусь”, якая фінансуецца Еўрапейскім Саюзам і рэалізуецца ПРААН, САЗ, ЮНІСЕФ і ЮНФПА ў супрацоўніцтве з Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

У рамках дыскусіі прэс-клуба рэгіянальных СМІ “Безбар’ернае асяроддзе: медыйны ракурс” прадстаўнікі 16 медыярэсурсаў Магілёва і вобласці абмеркавалі ролю сучасных СМІ ў фарміраванні безбар’ернага асяроддзя і грамадства роўных магчымасцяў. Удзельнікі пасяджэння адзначылі першарадную важнасць пераадолення, акрамя фізічных, таксама псіхалагічных бар’ераў чалавека і грамадства для паўнацэннай рэалізацыі правоў і магчымасцяў людзей з інваліднасцю. З прывітальным словам да ўдзельнікаў прэс-клуба звярнуўся Алег Пішчанка, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення, начальнік упраўлення ідэалагічнай работы Магілёўскага аблвыканкама. Ён нагадаў удзельнікам сустрэчы аб падпісанні і ратыфікацыі Беларуссю Канвенцыі аб правах людзей з інваліднасцю ў кастрычніку гэтага года і задаў напрамак дыскусіі: “Мы ўсе разумеем, што ратыфікацыя названай Канвенцыі не азначае, што жыццё людзей з інваліднасцю зменіцца ў адно імгненне. Сёння перад намі стаіць задача абмеркаваць ролю СМІ ва ўключэнні людзей у актыўнае сацыяльнае жыццё”.

Арганізатарамі мерапрыемства выступілі Праграма развіцця ААН, Магілёўскі абласны выканаўчы камітэт, Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Вялікую цікавасць ва ўдзельнікаў выклікаў круглы стол па Мэтах устойлівага развіцця, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі мясцовай улады і ўразлівых груп, а таксама эксперты ПРААН. Абмяркоўваліся пытанні

### Веснаўскі дом-інтэрнат

***Тацяна Лісоўская, вядучы навуковы супрацоўнік Нацыянальнага інстытута адукацыі:*** *“У рамках праекта Швейцарскага фонду па развіцці калектывам супрацоўнікаў Нацыянальнага інстытута адукацыі былі падрыхтаваны праекты і методыкі навучання самых цяжкіх дзяцей. Калі мы прыехалі ў Веснаўскі дом-інтэрнат, адразу ж зразумелі, што трэба ісці менавіта да такіх дзяцей. Нават пры стварэнні ўмоў добрага пражывання ўсё роўна недастаткова, каб дзіця, якое ляжыць, адчула сябе паўнацэнным чалавекам. Неабходна займацца пытаннямі адукацыі, падразумяваючы пад гэтым не проста традыцыйную адукацыю, а адукацыю як фарміраванне вобраза чалавека, гэта значыць усведамленне самога сябе. Як вынік гэтага праекта былі выпушчаны два дапаможнікі. Нас радуе, што ўсё менш становіцца ляжачых дзяцей, таму што выхавальнікі, якія працуюць з імі, у тым ліку і па гэтых дапаможніках, развіваюць гэтых дзяцей, і яны пачынаюць рухацца, потым трымацца, потым ісці, потым выходзіць у свет. І гэта тыя дзеці, пра якіх гаварылі, што яны ніколі не ўстануць, ніколі не загавораць і ніколі не пойдуць.*



Спорт і творчасць для дзяцей Веснаўскага дома-інтэрната — спосаб пераадолення сваіх хвароб

*Каштоўнасць для дадзенай катэгорыі дзяцей у навучанні сацыяльнаму досведу, у падрыхтоўцы да працоўных навыкаў і да магчымасці жыць у будучыні самастойна. Каб у рамках дома-інтэрната яны атрымалі прафесійныя навыкі ці падышлі да атрымання прафесіі”.*

***Кампанія “Інклюзіўная Беларусь”, якая праводзілася Арганізацыяй Аб’яднаных Нацый у Беларусі і Урадам Рэспублікі Беларусь у супрацоўніцтве з дзяржаўнымі і недзяржаўнымі арганізацыямі, пры ўдзеле прадстаўнікоў бізнесу і міжнароднай супольнасці, з’явілася лагічным працягам ініцыятывы “Экспрэс ААН-70 у Беларусі на шляху да Мэт устойлівага развіцця” і накіравана на дасягненне глабальнай мэты №10 (памяншэнне няроўнасці) і садзейнічанне больш поўнаму абмеркаванню ў рэгіёнах Парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года***



Аляксандр Грабянькоў, кіраўнік праекта ПРААН-ГЭФ “Павышэнне энергетычнай эфектыўнасці жылых будынкаў у Рэспубліцы Беларусь”, расказаў будучым уласнікам пра найноўшыя энергаэфектыўныя тэхналогіі, выкарыстаныя пры будаўніцтве, і пазнаёміў з асаблівасцямі іх эксплуатацыі

пра больш цеснае супрацоўніцтва для вырашэння праблем у сацыяльнай сферы вобласці. Спецыяльным госцем круглага стала стаў Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Германія ў Рэспубліцы Беларусь Петэр Дэтмар, які падзяліўся з удзельнікамі досведам Германіі ў памяншэнні няроўнасці ў грамадстве.

Каля 40 жанчын — кіраўнікоў буйных прадпрыемстваў і банкаў вобласці — селі за “парты” “Школы жаночага лідарства”, каб абмеркаваць пытанні гендарнай роўнасці і яе ўплыву на сацыяльнае і эканамічнае развіццё грамадства. “Школа” ў вобласці таксама арганізавана сумесна з Акадэміяй кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і грамадскім аб’яднаннем “Беларускі саюз жанчын”.

Адметнай асаблівасцю інклюзіўнай праграмы ПРААН у Магілёве стала экскурсія на першы ў абласным цэнтры жылы шматпавярховы энергаэфектыўны дом другога пакалення. У экскурсіі прынялі ўдзел будучыя жыхары энергаэфектыўнага дома, якія з цікавасцю даведаліся пра ўсе высокатэхналагічныя сакрэты іх будучага жылля.

Аляксандр Грабянькоў, кіраўнік праекта ПРААН-ГЭФ “Павышэнне энергетычнай эфектыўнасці жылых будынкаў у Рэспубліцы Беларусь”, расказаў будучым уласнікам пра найноўшыя энергаэфектыўныя тэхналогіі, выкарыстаныя пры будаўніцтве, і пазнаёміў з асаблівасцямі іх эксплуатацыі. Асноўнае пытанне, якое хвалявала большасць экскурсантаў, — наколькі моцна “пахудзеюць” іх жыроўкі за электрычнасць і ацяпленне. А маленькіх жыхароў арганізатары парадавалі падарункамі — настольнай гульнёй “Энергаполіс”, якая ў цікавай і зразумелай для дзіцяці манеры тлумачыць прынцыпы энергазберажэння. Гульня распрацавана яшчэ адным “энергаэфектыўным” праектам ПРААН — “Распрацоўка інтэграванага падыходу да пашырэння праграмы па энергазберажэнні”, які фінансуецца Еўрапейскім Саюзам.

Завяршыўся дзень кампаніі ў Магілёве інклюзіўным канцэртам у Палацы культуры вобласці. У зале быў поўны аншлаг: паслухаць папулярных беларускіх выканаўцаў, а таксама адкрыць для сябе новыя таленты і іх жыццёвыя гісторыі прыйшло больш за 1000 чалавек. У канцэрце прынялі ўдзел беларускі і расійскі R’n’B выканаўца Макс Лорэнс, спявак і шоўмен Дзядзя Ваня, віртуоз-баяніст Віталь Варанко, хор Беларускага медыцынскага ўніверсітэта “ДАМІНАНТА”.

**Цэнтр не раз праявіў сябе**

*__Дзяніс Глушневіч, галоўны інжынер Віцебскага прадпрыемства супрацьпажарных работ:__ "Мы стварылі добраахвотніцкі цэнтр супрацьпажарнай бяспекі ў аграгарадку Кавалі — гэтаЛіёзненскі раён Віцебскай вобласці. Самы блізкі пост МНС знаходзіцца за 25-30 кіламетраў. Таму мы і стварылі ў аграгарадку добраахвотную пажарную дружыну. Былі падабраныя ініцыятыўныя людзі, выдзелена пажарная машына за кошт гранта ЕС-ПРААН "Садзейнічанне развіццю на мясцовым узроўні ў Рэспубліцы Беларусь". Была добраўпарадкавана адукацыйная дзіцячая пляцоўка з супрацьпажарнымі элементамі. Менавіта такім практычным чынам мы вучым і дарослых, і дзяцей мерам супрацьпажарнай бяспекі. Па прынцыпе зацікаўленасці ствараем добраахвотныя пажарныя дружыны. Нездарма ў нашым раёне была арганізавана першая ў Беларусі змяшаная пажарная каманда — МНС і добраахвотнікі. А наш валанцёрскі цэнтр ужо не раз праявіў сябе".*



## Віцебск сустракаў гасцінна

Віцебск апошнім з абласных цэнтраў сустрэў рэгіянальную кампанію "Інклюзіўная Беларусь: не пакідаючы нікога ўбаку ў дасягненні Мэт устойлівага развіцця". Асноўнай пляцоўкай правядзення тут большасці мерапрыемстваў стала Канцэртная зала "Віцебск", куды раніцай 6 снежня прыбыў караван аўтобусаў кампаніі "Інклюзіўная Беларусь" з удзельнікамі і гасцямі з іншых гарадоў Беларусі і з-за мяжы. Па традыцыі адбылася афіцыйная цырымонія адкрыцця кампаніі і падпісання дэкларацыі прыхільнасці да Мэты ўстойлівага развіцця №10 з удзелам старшыні Віцебскага абласнога савета дэпутатаў Уладзіміра Цярэнцьева, намесніка Пастаяннага прадстаўніка ПРААН у Беларусі Кацярыны Паніковай і кіраўніка офіса Сусветнай арганізацыі аховы здароўя ў Беларусі Батыра Бердыклычава.

У фае Канцэртнай залы "Віцебск" былі разгорнуты выставы агенцтваў сістэмы ААН, грамадскіх аб'яднанняў, мясцовых ініцыятыў і пасольстваў Ізраіля, Палесціны і Швейцарскага Чырвонага Крыжа. Усе выставы былі прысвечаны пытанням роўных правоў і магчымасцяў, уключэння ў працэсы развіцця грамадства ўсіх людзей незалежна ад узросту, полу, этнічнай прыналежнасці, рэлігіі, паходжання.

"Кампанія "Інклюзіўная Беларусь" унікальная, таму што гэта адзіная кампанія, якую запусціла Праграма развіцця ААН у рэгіёне для дасягнення Мэт устойлівага развіцця. У прыватнасці, акцэнтуецца ўвага на тым, як Беларусь працуе з праблемамі сацыяльнай няроўнасці і высвечвае самыя лепшыя практыкі, якія ёсць у краіны ў гэтай сферы", — заявіла, выступаючы перад журналістамі, намеснік Пастаяннага прадстаўніка Праграмы развіцця ААН у Беларусі Кацярына Паніклова. Яна адзначыла, што падчас наведванняў Віцебскай вобласці агенцтвы сістэмы ААН праводзілі сустрэчы з прадстаўнікамі мясцовых органаў улады і грамадскіх арганізацый, каб лепш даведацца пра хвалюючыя іх праблемы.




Вядомы беларускі шоўмен Яўген Булка падчас мерапрыемства ў Віцебску ўручыў прызы з сімволікай ПРААН удзельнікам гульні ў "сляпы тэніс"

Праграма мерапрыемстваў у Віцебску ўключала ў сябе семінар па пытаннях інтэграванага мытнага цэнтра прадастаўлення паслуг, пасяджэнне прэс-клуба рэгіянальных СМІ, паказ фільмаў з праграмы Фестывалю фільмаў "Чалавечая годнасць, роўнасць і справядлівасць", інклюзіўны паказ мод, а таксама майстар-клас па вырабе штучных гнездзішчаў для соў і майстар-клас па вырабе паштовак.

Пытанні развіцця лідарскіх якасцяў у прадстаўніц прыгожага полу Віцебскай вобласці можна было абмеркаваць у "Школе лідарства для жанчын". Пытанні інклюзіі таксама абмяркоўваліся на круглым стале з адміністрацыяй вобласці, прадстаўнікамі агенцтваў сістэмы ААН, дыпламатычнага корпуса і грамадскіх аб'яднанняў.

Уладзімір **Міхайлаў**

# Дзве капейкі,
## альбо Тэст на чалавечнасць



**Тыя бліскучыя дзве капейкі мне не забыць ніколі. І калі я бяру ў рукі дробязь, якая з лета з’явілася ў грашовым абарачэнні, усялякі раз успамінаю тую юную дзяўчыну і ўсміхаюся…**

Я на сядзела за касай у вялікім універсаме ў адным з раёнаў Мінска і вельмі адрознівалася ад іншых, не менш сімпатычных касіраў. Але яе фішка была ў прамяністай усмешцы і асаблівым, не дзяжурным, сказала б, у неабыякавым водгуку на пытанні пакупнікоў. Фразы: “наступны”, “праходзьце”, “слухаю вас” — у вуснах гэтай маладзенькай касіркі Галіны Лугафет, гучалі так цёпла і прыязна, што хацелася стаць толькі да яе. Што я рабіла, хоць у суседнія касы чэргі, здаралася, былі і меншыя…

У дні перад Раством, святкі, як мы прывыклі іх называць, мне ўспомнілася гэтая даўняя гісторыя. Яе галоўнай гераіні ў той час было 18. І не называць яе памяншальна-ласкальным іменем — Галачка, Галінка было проста немагчыма. Здалёк яна нагадвала пухнаты дзьмухавец: такімі лёгкімі, амаль бязважкімі, падаваліся яе кучаравыя папялістыя валасы.

Было мінулае стагоддзе… 90-я… Як вядома, то быў час перамен. Распад СССР, цяжкі перыяд у грамадскім жыцці ды ў Беларусі. Ламаліся звыклыя ўстоі, мянялася свядомасць

людзей, лад іх жыцця. Сімвалам гандлю тых гадоў, пра што прачытаем у інтэрнэце (https://news.tut.by/society/404016.html), былі абмежаванні і нормы водпуску амаль усіх тавараў: ад круп і цукру да тэлевізараў і халадзільнікаў. Талоны, купоны — без іх нават з грашыма ў магазіне рабіць было няма чаго. І, безумоўна, усё гэта адбівалася на нервовай сістэме і пакупніка, і прадаўца. Пустыя прылаўкі, купоны, талоны, нормы… Гэта была рэальнасць, у якой мы апынуліся. Але лёгка было толькі тым, хто здольны быў успрымаць яе адэкватна.



З купонамі ў касу Галачкі стаяла і я, разважаючы пра тое, як паводзім сябе мы, людзі, у цяжкіх жыццёвых сітуацыях. Асабіста мяне ні доўгія чэргі, ні талоны і купоны на прадукты не бянтэжылі. Без ілжывай сціпласці скажу, што была змоладу ў ліку шчаслівчыкаў, якія кіруюцца старой добрай мудрасцю: калі не можаш змяніць сітуацыю, змяні адносіны да яе. Я і не ведаю, адкуль мне ўжо ў юнацтве было вядома пра тое, што пазітыўнае мысленне раскрывае нашы патэнцыйныя магчымасці і ўмацоўвае, а схільнасць да засмучэння разбурае. Верагодна, уся справа ў генах бацькоў, якія перажылі Вялікую Айчынную вайну, голад і бязладдзе, умелі радавацца малому.

Але вярнуся да Галі. Назіраючы, як тая паводзіць сябе ў складаных сітуацыях з грамадзянамі, якія атавараваліся і былі ў той час падобныя да гаманлівых варон, якія абрушвалі на касіраў шквал незадаволенасці: то каўбасы ім не дасталася, то цукру — ціха радавалася за “маю” дзяўчынку. Яна была не проста далікатная і ветлівая, яна была дружалюбная. І было відаць, што такі стан уласнай душы ёй падабаецца. І цярпліва паспявала, як бы між іншым, растлумачыць пакупнікам што да чаго. І пры гэтым усмешка не сыходзіла з яе твару. І тыя, як ні дзіўна, супакойваліся. Не задаволеных тлумачэннямі адсылала да адміністратара або да матэрыяльна адказных асоб.

Так, здараліся і ў яе працоўным жыцці складаныя моманты, калі градус пакупальніцкіх эмоцый зашкальваў, апякаў, а то і выклікаў слёзы. Яна шчыра здзіўлялася, чаму людзі не разумеюць, што яна, просты касір, можа і не ведаць усіх тонкасцяў, звязаных з тавараабаротам у магазіне. Калі пакупнікі выказвалі ёй падзяку нават у форме “дзякуй”, Галачка ўсміхалася. Злёгку бянтэжачыся, з унутранай годнасцю прымала падзяку. А ўжо калі гэта быў малюсенькі букецік пралесак або цукерка, якую пакупнікі клалі на краёчак падстаўкі



пад касавы апарат, яе твар ружавеў, а зялёныя вочы станавіліся вільготнымі.

Мая гісторыя з Галяй пачалася з “двушкі”. Аплачваць тэлефонную размову ў тыя часы можна было адной манетай у 2 капейкі ці дзвюма манетамі па адной. Яны змяшчаліся ў спецыяльны паз, і калі на іншым канцы проваду бралі трубку — правальваліся ўнутр тэлефона. Калі дазваніцца не атрымлівалася — грошы заставаліся ў пазе. У тыя часы двушка была на вагу золата. Кінуўшы яе ў вочка тэлефона-аўтамата (ён у савецкі час сустракаўся на кожным рагу вуліцы), можна было мець зносіны з сябрамі або раднёй падоўгу: нават працяглы час тваёй размовы каштаваў усяго дзве капейкі. У эпоху, калі не было мабільнай сувязі, гэта было вельмі зручна. Тым больш што кватэрныя тэлефоны былі таксама не ва ўсіх. Таму каштоўнасць двушак была высокая. Імі запасаліся на перагаворных пунктах і ў магазінах, дзе разлічваць прыходзілася на шчодрасць касіра. Далёка не кожны яе праяўляў і адгукаўся на просьбу памяняць, скажам, дзесяць або дваццаць капеек па дзве. Яно і зразумела: дробязь патрэбна была для рэшты пакупнікам. Дый імгненна дагадзіць просьбіту, які жадае памяняць па дзве або па адной капейцы, і пры гэтым не памыліцца ў падліку тавара ў пакупніцкім кошыку, больш за тое — не здабыць нездаволенасці ў чарзе — на гэта быў здольны не кожны касір і ва ўніверсаме, дзе працавала Галіна. У чым я і сама пераканалася.

Быў якраз позні марозны вечар перад Раством. Па хрысціянскай праваслаўнай традыцыі яно святкуецца 7 студзеня. Мне тэрмінова трэба было патэлефанаваць у дзяжурную начную аптэку, удакладніць, ці ёсць там лякарствы для захварэлага сынка. Як знарок, у кашальку няма ні адзінак, ні двухкапеечнай манеты. Апранаюся, лячу праз дарогу да ўніверсама. Памяняць дробязь ля аўтаматаў не атрымліваецца: там пуста. Народ, ужо атаварыўшыся ў магазіне,

ды яшчэ ў такі траскучы мароз сядзіць па дамах. Уваходжу ў паўпусты універсам, кідаюся да адной касы, да другой, да трэцяй… Ні ў аднаго з касіраў няма для мяне "двушкі". Каса Галачкі пустуе. Выйшла, відаць, думаю я, накіроўваючыся ў гандлёвую залу, прыкідваючы, што ж можна купіць, каб на рэшту мне далі хоць бы па капейцы. І, о шчасце, раптам бачу, як мая светлая дзяўчынка садзіцца за касу…

Я была выратавана. У майго "дзьмухаўца" знайшліся манеты і па капейцы, і па дзве… І потым, колькі б мне ні даводзілася прасіць у Галі гэтыя злашчасныя "двушкі", яны ў яе заўсёды былі для ўсіх, хто б ні папрасіў. Падавалася б, ну што такога асаблівага яна зрабіла: усяго толькі дзве капейкі… "Ты іх што, спецыяльна збіраеш, каб не адмаўляць людзям", — спытала ў яе неяк. На што яна мне адказала сцвярджальна, дадаўшы: калі "хуткая дапамога" своечасова не прыедзе, можна і памерці… Адказ мяне ўразіў: адкуль у ёй, зусім маладзенькай, такое разуменне крытычных жыццёвых сітуацый…

Не раз задавалася пытаннем, чаму ні ў адной з кас універсама касір не адгукнуўся ў той вечар перад Раством. Ці то ўжо здалі "касу", ці то стомленыя за дзень касіркі не былі схільныя "рабіць дабро"… Але, відаць, сам лёс прадаставіў мне падставу пазнаёміцца з Галачкай бліжэй, а потым і пасябраваць. Так мы абедзве сабе гэта і растлумачылі з гадамі. Аднойчы, гледзячы, як тая стамілася за дзень, але пры гэтым усё роўна ўсміхаецца, запрасіла зайсці пасля працы на гарбату: у інтэрнаце дзяўчыну ніхто не чакаў. Слова за слова, разгаварыліся. Аказалася, яна родам з Заходняй Украіны, з мястэчка Залешчыкі. Магчыма, агульныя ўкраінскія карані таксама пацягнулі нас адна да адной: я з паўднёва-ўсходняй яе часткі. Але, мяркую, усяго толькі часткова. Хутчэй, мне імпанавала тая прыродная годнасць, з якой трымалася гэтая дзяўчынка, а таксама яе ўменне чуць і слухаць суразмоўцу. Што і гаварыць, рэдкая якасць у зносінах. А яе добразычлівасць, добрасардэчнасць і зусім паслужыла нам падставай назваць адна адну названымі сёстрамі. Немалую ролю сыграў і мой сын: камертон яго душы лёгка настройваўся на чыстую душу Галюні. Так я ахрысціла яе на ўкраінскі лад. Ёсць такія людзі, з якімі побач утульна і камфортна. Яна, цёплы чалавек, у іх ліку. А яшчэ нас зблізілі і ўкраінскія песні, якія мы, сустракаючыся ў святы, спявалі з ёй сябрам, а тыя з задавальненнем падхаплялі і падпявалі на беларускай мове.

Галя не затрымалася ў нашым універсаме. Хутка стала расці прафесійна. Асвойвала вышэйшыя прамудрасці таваразнаўства ды арганізацыі харчовых тавараў у тагачасным Інстытуце народнай гаспадаркі. І заадно спасцігала мастацтва пабудовы гарманічных адносінаў у сям'і, гадавала дзвюх дачок-прыгажунь Юлію ды Таццяну. А потым, як гаворыцца, пайшла і пайшла ўверх па кар'ернай лесвіцы…

Сёння яна — дырэктар аднаго з буйнейшых мінскіх супермаркетаў, у яе ў падначаленні больш як сотня чалавек. І ўжо колькі гадоў велічаюць яе Галінай Васільеўнай. Любімы па жыцці чалавек, які на гады захаваў і прымножыў захопленыя да яе адносіны, называе яе Галачкай. Так і сябры-прыяцелі звяртаюцца. А я па-ранейшаму клічу яе Галюняй. І ўжо спецыяльна не назіраю, як яна трымае сябе ў гандлёвай зале магазіна, якім кіруе, калі час ад часу туды прыязджаем закупляць прадукты. Хоць і не блізкі, што называецца, свет ад дома, а ездзем. Атмасфера там прыемная: прадаўцы ветлівыя і паслужлівыя. А пах свежай выпечкі, піцы бударажыць нюх… І паўсюль — чысціня. Вось ужо сапраўды, чысцёха будзе чысцёхай усюды. Прыадкрыю сакрэт: дома ў яе ўсё зіхаціць, а ўжо пра рэчы, якія ў адзежнай шафе ляжаць на паліцах, размова асаблівая: іх нібы пад лінеечку там выкладвалі. Бог мой, а як гатуе… Можа, таму і ў магазіне ў аддзеле гатовай прадукцыі ўся кулінарная прадукцыя са знакам якасці. Адным словам, гаспадыня яна і ёсць гаспадыня. Аднойчы я атрымала ад яе прачуханку, выбіраючы кавалкі цвёрдага сыру. Узяла адзін, другі, трэці… То вага мяне не задаволіла, то брэнд. І не заўважыла, як клала гэтыя кавалкі на месца. Раптам чую строгі шэпт: як кладзеш? акуратна пакладзі… І як у той момант Галя каля мяне апынулася, розуму не дабяру.

Вядома ж, яна валодае тым "джэнтэльменскім" наборам прафесійных якасцяў, якія адрозніваюць добрага менеджара. У арсенале яе здольнасцяў: і інтэлект, і разважлівасць, і ўменне выказваць свае думкі… І ўпэўненасць у сабе сярод асабістых яе асаблівасцяў займае не апошняе месца. І камунікатыўныя якасці яе высокія. Галіну, прывабную, прыветлівую з усімі, хто да яе звяртаецца, часта можна ўбачыць у зале, хоць, падавалася б, клопату ў яе хапае і ў кабінеце. Я бачыла, як паважліва ставяцца да яе падначаленыя: малодшыя прадаўцы, касіры, адміністратары залы, супрацоўнікі аховы і загадчыкі секцый… Аднак не бяруся ўнікаць у падрабязнасці яе дырэктарскага аблічча, паколькі гэта ўжо тэма для іншай гісторыі. Я пра іншае. Пра чалавечнасць, вельмі каштоўную якасць у нашу эпоху звышхуткасных рытмаў і гаджэтаў. І мы, сталыя людзі, да іх схільныя і імі, чаго граху таіць, захопленыя. Замыкаючыся ў сваёй асабістай прасторы, усё радзей бачымся з сябрамі і раднёй, абменьваючыся ў святы відэаролікамі і стыкерамі. І гэта, прызнаюся, весела. Сёння і дзядкі з гаджэтамі — прывычная з'ява. Мы, як недзе я прачытала, стварылі мноства камп'ютараў для захоўвання і капіравання вялікіх аб'ёмаў інфармацыі, але сталі менш мець зносіны адно з адным. І прарабіўшы доўгі шлях да Месяца, з цяжкасцю знаходзім час для таго, каб перагаварыць з новым суседам. Ці страчваем нешта пры гэтым? Адказаць, як гаворыцца,

***Як у кроплі вады адлюстроўваецца акіян, так і ў дробязях можна ўбачыць сутнасць чалавека: яго здольнасць адгукацца на чужую бяду і чужую радасць***

за ўсіх не бяруся. Але па сабе ведаю: жыццё без зносінаў з дарагімі людзьмі часам прэснае, як ежа без солі ды спецый. І нават гаджэты, займаючы, тады не ратуюць. Бо чалавеку, усім вядома, патрэбны чалавек — гэта ісціна старая як свет. Вось таму напярэдадні Калядаў мы з мужам ужо некалькі гадоў запар ездзім на Лагойшчыну, у мястэчка Пасадзец, у госці да маці Галюні, куды яна пераехала з Украіны, каб быць бліжэй да дзяцей. Гэты гасцінны, добры і спагадлівы чалавек — Раіса Цімафееўна па добрай украінскай традыцыі ладзіць для дзяцей, унукаў і праўнукаў вечар з куццёй, а назаўтра багаты калядны стол. Гэта ад яе, народжанай і выхаванай у вялікай і працавітай сям'і старавераў з расійскай вёскі Ялантава, што пад Набярэжнымі Чаўнамі, усё лепшае перадалося і маёй названай сястры. І нават здольнасць складаць у шафе рэчы "пад лінеечку". І ўменне, паўтаруся, мець дружалюбныя зносіны з людзьмі, дзе б ні жыла. І ўкраінскія песні спяваць за сталом, і радасцю дзяліцца. Вось такія яе, Цімафееўны, гаджэты. І цяпер я разумею, што, як у кроплі вады адлюстроўваецца акіян, у той двухкапеечнай манеце знайшла адбітак вялікая душа маёй Галюні ўжо ў яе маладыя гады.

Сёння ўсё часцей можна сустрэць маладых людзей, якія ідуць уткнуўшыся ў свае гаджэты. Натрапіўшы на прахожых, яны паднімаюць вочы і некалькі секунд спрабуюць зразумець, дзе знаходзяцца і што адбываецца вакол. Ды зноў сыходзяць у віртуальны свет, у якім ляціць іншае жыццё, далёкае ад рэальнасці. Але гэта, па-мойму, не так ужо і страшна. Мне самой не раз даводзілася адцягваць іх увагу ад гаджэтаў у трамваі, метро і нават у гандлёвым цэнтры. Аднойчы папрасіла ў хлопца скарыстацца яго тэлефонам: свой дома забыла. І няхай не імгненна, але ён адгукнуўся, і калі "ўехаў" у маю "праблему", тут жа ахвотна дапамог яе вырашыць. Бачыла не раз, як ускокваюць маладыя людзі, экіпіраваныя навушнікамі, планшэтамі, айфонамі, саступаючы месца пажылым людзям у трамваі і метро. Магчыма, гэта маё шанцаванне: раўнадушных з гаджэтамі не сустракаю. Таму час ад часу думаю: напэўна іх бацькі чымсьці падобныя да маёй Галюні.

Валянціна **Ждановіч**


Любімыя кветкі Галіны — архідэі



# Ход канём

**У звычайным жыцці ва Уладзіміра Азаркі дзяцей нават вельмі шмат. Як-ніяк ён — вадзіцель школьнага аўтобуса, які калясіць па дзясятку вёсак Верхнядзвінскага раёна. На працягу ўжо 12 гадоў і стандартных 150 кіламетраў штодзённага шляху гэты чалавек дэманструе сваю стрэсаўстойлівасць, толькі ўсміхаючыся дзіцячым свавольствам у салоне аўтобуса. Але і гэтых зносінаў, здаецца, вадзіцелю мала: некалькі гадоў назад Уладзімір у сваёй роднай вёсцы Юсціянава зарэгістраваў аграэкасядзібу. Купіў некалькіх канёў. Цяпер катае дзяцей з усёй акругі. Бясплатна.**

Уладзімір сустракае мяне каля брамкі.

— Не, як сапраўдны вадзіцель аўтобуса, плату за праезд на сваіх конях я бяру, — апраўдваецца ён. — Праўда, далёка не заўсёды яна грашыма. Часцей добрым настроем.

На заднім двары ў загародцы б'юць капытамі коні — наравістая Нара, белая Чайка, свавольны Чарот. Самая спакойная Зорка. Яно і зразумела: ёй нядаўна стукнула 20 гадоў, пара б і пасталець. Усяго шэсць жывёл, якіх ведае, напэўна, уся дзятва раёна. Ды і не толькі яна. Уладзімір са сваімі гадаванцамі жаданы госць на ўсіх мерапрыемствах Верхнядзвінска, ці то масленічныя гулянні, ці то Дзень горада. А яшчэ ўжо тры гады ў сядзібу прывозяць дзяўчынку з хворымі ножкамі з Наваполацка. Яе бацькі расказалі, што даўно спрабавалі прымяняць іпатэрапію, вазілі дзіця па розных конных школах і сядзібах.

Але толькі тут дзяўчынка знайшла эмацыйны кантакт з канём.

Гісторыя стварэння аграсядзібы ва Уладзіміра некалькі нестандартная. Ён нават не спрабаваў скласці бізнес-план. Ды і зарабляць на гэтай справе не планаваў. Проста гадоў дзесяць назад, пасля пераезду ў Юсціянава, купіў сабе каня. Агарод узараць. У лес з'ездзіць. Ды і проста ў якасці хатняга гадаванца. Сумна было Уладзіміру. Адзіны сын даўно вырас, жыве ў Нясвіжы — няблізка. Да таго ж да коней з дзяцінства прывык: у бацькоў, колькі сябе памятае, была вялікая гаспадарка, у тым ліку і некалькі канёў.

Юсціянаўскія дзеці глядзелі-глядзелі на конную язду Уладзіміра ды аднойчы папрасілі пракаціць. З тых часоў і павялося. "Добры ён чалавек, нікому адмовіць не можа", — характарызавалі гаспадара аднавяскоўцы, пакуль той, кінуўшы ўсе справы, гадзінамі катаў юных гасцей на кані.

З часам ва Уладзіміра з'явілася яшчэ пару канёў. Для душы, пераконвае гаспадар. Шукаў іх па ўсёй акрузе. Адну жывёліну набыў у сумным стане, худую, хворую. Некалькі месяцаў хадзіў за ёй, як за малым дзіцем, у ветэрынара дняваў і начаваў. Выходзіў і — пад сядло. Тым часам гасцей на падворку станавілася ўсё больш. Знаёмыя заўважылі падобны ажыятаж і пачалі раіць: "Рэгіструй аграсядзібу, мілы чалавек! Глядзіш, і даход будуць твае пакатушкі прыносіць".

У акрузе конных школ няма. Бліжэйшая профільная арганізацыя — за пяцьдзясят кіламетраў, у Асвеі. Здавалася б, тут Уладзіміру і карты ў рукі. Вось толькі бізнес не задаўся з самага пачатку. Знаёмыя наракалі гаспадару за адсутнасць дзелавой жылкі. Сам Уладзімір апраўдваецца чыста па-чалавечы: "Вёска. Зарплаты маленькія. Адкуль у дзяцей ды іх бацькоў грошы на такія забавы?" Адмовіць жа гасцям не ў сілах.

Таксу за катанне Уладзімір усё ж устанавіў — 50 капеек. Параўнанне з расцэнкамі іншых аграсядзіб можа выклікаць толькі ўсмешку. Прычым аплата добраахвотная.

Нядаўна адзін з кітайскіх рэстаранаў увёў рэвалюцыйную сістэму расцэнак паслуг. Наведвальнікі плацілі хто колькі хацеў. "Завостраны" пад атрыманне прыбытку бізнес праз 3 месяцы з трэскам лопнуў, разбіўся аб людскую сквапнасць. Уладзімір, па вялікім рахунку, пабудаваў бізнес на такім жа прынцыпе. Аднак насуперак разумнаму сэнсу працуе ўжо 3 гады — у справе вадзіцеля "руліць" альтруізм. Няма ў хлопца грошай — няхай катаецца проста так! Ёсць магчымасць заплаціць — ніхто з наведвальнікаў не адмовіцца. А астатнія сродкі на развіццё гаспадар траціць з зарплаты. "Адзін хамут для каня каштуе 700 рублёў. Сядло і таго даражэй. Але я не лічу, што грошы дарма марную. Гэта для душы. Мае коні здаровыя, і я з імі маладзею".



Хоць хапае са свойскімі жывёламі і клопату. Справа нават не ў тым, што ім трэба назапасіць корму на зіму або вупраж справіць. Кожны конь унікальны па складзе характару. Каб знаходзіць з імі агульную мову, трэба мець незвычайныя задаткі заолага, ветэрынара і нават псіхолага. Асновы гэтых прафесій Уладзімір спасцігае паступова, прызнае, што да прафесійнага конюха яму яшчэ вельмі далёка. "Стрыжэ конь вушамі — значыць, яго нешта турбуе. Закідвае галаву — раздражнёны. Адмаўляецца есці — відавочна, прыхварнуў... Куды бегчы, каму паказваць? Балазе ветэрынар мясцовы ў прыёме не адмаўляе".

Павялічваць пагалоўе коней спецыяльна Уладзімір не плануе. Хоць не адмаўляе: калі прапануюць купіць, будзе шукаць сродкі. Тым больш што планы на будучыню ў гаспадара вялікія. Сёння гасцей катае на самаробнай брычцы або вярхом, праводзіць прагулкі па лесе, паказвае славутасці. Рыхтуецца да арганізацыі конных паходаў. Праўда, перад гэтым трэба падцягнуць веды. А таксама распрацаваць дакладныя правілы тэхнікі бяспекі. Адна справа катаць дзіця, трымаючы каня за аброць. Зусім іншая — пасадзіць у сядло і дазволіць самастойна кіраваць. Уладзімір — чалавек добры і спагадлівы, але адказнасці яму не займаць.

Зноў жа, бізнес-плана для аказання дадатковых паслуг ва ўладальніка сядзібы і заваду няма. Аднавяскоўцы гатовыя на смех падняць, але Уладзіміра гэтым не праймеш. "Калі атрымліваецца — чаму б не вадзіць коней?" І атрымліваецца ж.

Год назад у юсціянаўскую аграэкасядзібу наведалася старшыня латвійскага бюро Дырэктарата Еўрарэгіёна "Азёрны край" Ілзе Стабулніеце — сама гаспадыня вядомай коннай сядзібы. Ілзе па заслугах ацаніла граматны догляд коней, цікавілася планамі развіцця коннага турызму, а ў канцы прапанавала супрацоўніцтва. Хто ведае, магчыма, дабрыня Уладзіміра калі-небудзь і акупіцца.

Сяргей **Мураўскі**



# Вялікі Шаўковы шлях

## Беларус і таджык напісалі раман пра старажытныя Туркменістан і Кітай

Беларускі часопіс “Нёман” ужо публікаваў занатоўкі нашага земляка Леаніда Чыгрына, які жыве ў Душанбэ, пра яго дачыненне да Беларусі, пра тое, як яго сям’я апынулася ў Сярэдняй Азіі. Крыху нагадаем, што Леанід Чыгрын — гэта рускі пісьменнік, перакладчык, публіцыст, кінасцэнарыст, які жыве і працуе ў Душанбэ, Таджыкістане. А нарадзіўся ў 1942 годзе ў Беларусі, на Віцебшчыне. Маці была ўдзельніцай антыфашысцкага падполля, апынулася ў нямецкім канцлагеры. Хлапчука выхоўвала бабуля. Калі вайна скончылася, маці вярнулася дадому. Здароўе было падарвана. Урачы параілі змяніць клімат. Так маладая жанчына з маленькім дзіцем апынулася ў Таджыкістане. А яшчэ раней туды адправілася старэйшая сястра беларускай падпольшчыцы. У 1946 годзе маці Лёні Чыгрына памерла. Хлапчука далей выхоўвала цётка. Неўзабаве вярнуўся з арміі бацька. Але сям’ю напаткала яшчэ адна страшная бяда: Мікалай Чыгрын загінуў у шахце...



Леанід Чыгрын

Прайшлі гады. З хлапчука, які зрадніўся з Таджыкістанам, выдатна вывучыў таджыкскую мову, вырас таленавіты журналіст і пісьменнік. Шматлікія творы таджыкскіх паэтаў, празаікаў і драматургаў сталі вядомыя ў перакладзе на рускую мову дзякуючы менавіта Леаніду Чыгрыну.

Але вось і ў тых “нёманскіх” занатоўках слаба прыадкрываецца лёс літаратара як актыўнага працаўніка на ніве гістарычнай раманістыкі. Якраз пра гэта і хацелася б расказаць. У суаўтарстве з вядомым таджыкскім раманістам Ато Хамдамам у апошнія гады наш зямляк працуе над шырокамаштабным творчым праектам “Таямніцы гісторыі”. А адкрыў серыю займальных, дынамічных твораў гістарычны раман у дзвюх частках “Жыццё Чжан Цяня або Вялікі шаўковы шлях”. У цэнтры апавядання, якое цяпер ужо выдадзена на таджыкскай, рускай, туркменскай ды кітайскай мовах, лёс неардынарнага чалавека, які з’яўляецца родапачынальнікам Вялікага шаўковага шляху. Адправіўшыся шукаць саюзнікаў для Кітая, у 138 годзе да нашай эры Чжан Цянь трапіў у палон да гунаў. Пасля дзесяці гадоў рабства, звя-

занага са многімі няпростымі, цяжкімі выпрабаваннямі, мужны падарожнік трапіў у Бактрыю.

І многія ідэі будучага Вялікага шаўковага шляху атрымалі сваю рэалізацыю на тэрыторыі якраз цяперашняга Туркменістана. Чытаем у рамане Леаніда Чыгрына і Ато Хамдама: “Пасол кітайскага імператара і правадыр племені бактрыйцаў моўчкі глядзелі на звілістую лінію Вялікага шаўковага шляху, намаляваную на гладкім пяску ля іх ног.

— Я перанясу гэты чарцёж на паперу і пакажу імператару, — сказаў Чжан Цянь. — Вялікі шаўковы шлях стане мостам, які злучыць не толькі далёкія краіны, але і людскія сэрцы”.

Забягаючы наперад, хачу адзначыць. Раман Леаніда Чыгрына і Ато Хамдама напісаны вельмі дынамічна. Героі і падзеі паказаны выпукла, рэльефна. Нават першае чытанне кнігі пераконвае: перад намі — аснова кінасцэнарыя. Фільм аб зараджэнні Вялікага шаўковага шляху пасля, несумненна, мог быць цікавы і туркменскаму гледачу. Вось бы зрабіць такі фільм разам — Беларусі, Туркменістану, Кітаю і Таджыкістану!..

Раман беларуса Леаніда Чыгрына і таджыка Ато Хамдама (дарэчы, ён з’яўляецца членам Саюза пісьменнікаў Беларусі) “Жыццё Чжан Цяня або Вялікі шаўковы шлях” прыйшоў сёння і да туркменскага чытача. Бываючы ў апошнія гады ў Туркменістане, я расказаў пра Чыгрына і яго творчасць Агагельды Аланазараву — дзіцячаму паэту, празаіку, які таксама ў апошнія 10-15 гадоў працуе над гістарычнымі раманамі.




— Пра Чыгрына я чуў ад яго суаўтара Ато Хамдама, — адгукнуўся на мае аповеды Агагельды. — Ато — частыгосць у Туркменістане. Бывае на выставах “Залатая кніга”, якія мы штогод праводзім у Ашгабаце. І, вядома ж, хацелася б выдаць нешта з іх кніг, тэматычна звязаных і з Туркменістанам, старажытнай нашай зямлёй, і на туркменскай мове. Вельмі спадзяюся на гэта…

Упэўнены, што раманы Ато Хамдама і Леаніда Чыгрына сталі б у адзін рад з гістарычнай прозай туркменскіх аўтараў розных пакаленняў: Берды Кербабаева, Клыча Куліева, Хыдыра Дэр’ева, Нарклыча Хаджагельдыева, многіх іншых таленавітых аўтараў.

Некалькі слоў пра біяграфічную, жыццёвую повязь Леаніда Чыгрына і Ато Хамдама з Туркменістанам. Леанід Чыгрын у свой час служыў у гэтай гарачай і цёплай краіне салдатам. Ато Хамдам — частыгосць у Ашгабаце. Як кнігавыдавец і перакладчык ён вельмі шмат зрабіў для развіцця таджыкска-туркменскіх літаратурных сувязяў.

Кірыл **Ладуцька**



## Узысці на сем вяршынь…

**Чаго не зробіш дзеля паспяховай здачы сесіі? Некаторыя гатовыя нават за ноч вывучыць кітайскую мову. А калі на носе абарона дыплома? Будучы біёлаг Васіль Еўсікаў да справы падыходзіць творча.**

Свой дыпломны праект Васіль Еўсікаў, студэнт Гродзенскага дзяржаўнага аграрнага ўніверсітэта, вырашыў прысвяціць флоры афрыканскіх тропікаў і для гэтага нават здзейсніў узыходжанне на Кіліманджара. Да альпінісцкага лагера смяльчак дабіраўся амаль трое сутак. Спачатку працяглы авіяпералёт з перасадкамі, затым пешы пераход праз джунглі пад трапічным ліўнем. Пакарэнне найвышэйшай вяршыні свету пачалося ва ўмовах невыноснай афрыканскай спякоты, а завяршылася пры дваццаціградусным марозе. Разам з нашым земляком падніmaліся альпіністы з Расіі і Украіны. Са спадарожнікамі студэнт з Гродна пазнаёміўся праз інтэрнэт.

— Безумоўна, без трэніровак у мяне нічога не атрымалася б, — расказвае Васіль Еўсікаў. — Тры-чатыры разы на тыдзень я прабягаў па дзесяць кіламетраў. У трэнажорцы мацаваў спіну, каб лягчэй было несці груз. Напэўна, галоўнай складанасцю для мяне было кіслароднае галаданне. Калі чалавек адчувае недахоп паветра, у яго пачынаюць выяўляцца сімптомы горнай хваробы, кружыцца галава, рэзка зніжаецца працаздольнасць і вынослівасць. Нас выручалі салодкая газіроўка і шакалад.

І вось яно, доўгачаканае імгненне перамогі! На вышыні амаль шэсць тысяч метраў Васіль устанавіў сцяг роднай альма-матар. Але пры гэтым прызнаецца, што на фінішы ён не зведаў ніякіх эмоцый:

— Здавалася, што будзем крычаць ці скакаць ад радасці, адчуваць сябе героямі. Але ўжо на самой вяршыні мы знаходзіліся ў стане поўнага знясілення. Нас больш займала пытанне, як знайсці сілы на спуск і цэлымі вярнуцца назад. Усведамленне прыйшло пазней. З’явілася нерэальная ўпэўненасць у сваіх сілах. Менавіта ў горах я адчуў, якім павінна быць сапраўднае жыццё, дзе на першым плане сяброўства, узаемадапамога, згуртаванасць і адказнасць.

Усе свае назіранні і адкрыцці Васіль абавязкова выкарыстае ў навуковай працы. Цяпер у яго з’явілася новая мара — узысці на сем вяршынь шасці кантынентаў. І першым пунктам на гэтым маршруце стане гара Касцюшкі ў Аўстраліі.



БЕЛТА





# Яшчэ не ўсе таямніцы разгаданы

## Пяць прычын паехаць у Слонім



### Ацаніць спадчыну Агінскіх

**1** У цэнтры Слоніма ёсць мемарыяльная дошка, надпіс на якой прысвечаны Міхалу Казіміру Агінскаму — літоўскаму гетману і аднаму з прэтэндэнтаў на польскі прастол. На яго грошы пабудавалі знакаміты Агінскі канал, які злучае Балтыйскае і Чорнае мора.

Па яго заказе італьянскі архітэктар пабудаваў тэатр па апошнім слове тэхнікі той эпохі: дэкарацыі маглі перанесці і на бераг возера, і ў горы, артысты лунал і над сцэнай, а феерверкі асвечвалі яе тысячамі агнёў. На сцэне выступалі італьянскія, нямецкія, польскія спевакі, прыгонны хор і балет. Былі свае балетная і музычная школы.

Там музычную адукацыю атрымаў і яго знакаміты пляменнік Міхал Клеафас Агінскі. У яго гонар кожны дзень апоўдні з пажарнай вежы гучыць бессмяротны паланэз “Развітанне з радзімай”. У маі праходзіць міжнародны фестываль “Паланэз”. І гэта добрая падстава прыехаць — увесь горад ператвараецца ў адну сцэну, дзе спяваюць, танцуюць ды іграюць музыканты з розных краін.

### Адшукаць скарб Альберціна

**2** Графскую сядзібу Альберцінаў у прыгарадзе Слоніма ахоўваюць два каменныя львы. Двухпавярховы бірузовы палац у стылі позняга класіцызму дае ўяўленне пра архітэктурную моду таго часу. Захаваліся гаспадарчыя пабудовы: флігелі,уязныя вароты — брама, млын, стайня. Паркавая гаспадарка з сажалкамі, вадаспадамі і прыгожымі алеямі — любімае месца адпачынку гараджан.

Спачатку сядзіба называлася Юрзнікі. Але пасля гібелі Альберта — аднаго з любімых сыноў гаспадара дома, графа Войцеха Пуслоўскага, — яе сталі называць Альберцін. Паводле легенды, малады чалавек хацеў выратавацца ад праследавання за ўдзел у паўстанні 1863 года. Сцягнуў усе фамільныя каштоўнасці — і патануў, калі спрабаваў пераправіцца на другі бераг. Возера, дарэчы, таксама з тых часоў носіць яго імя. І сёння многія авантурысты не губляюць надзеі знайсці зніклыя скарбы.







АЛЕНА СЯМЁНАВА



Слонімская мазаіка

## Адпачыць каля “Эйфелевай вежы”

**3** Каб убачыць “жалезную даму”, зусім не абавязкова ехаць у Парыж. У цэнтры горада два гады назад з’явілася свая славутасць з французкім глянцам. Вядома, макет знакамітай вежы меншы, чым арыгінал. Але паспеў стаць цэнтрам прыцягнення — прыезджыя абавязкова зазіраюць сюды, каб зрабіць фотасесію, прыязджаюць гуляць вяселле маладыя з Мінска ды іншых гарадоў.

Яшчэ варта зірнуць на помнік у гонар герба Слоніма. Ён быў зацверджаны ў 1591 годзе, калі кароль Жыгімонт III падарыў гораду права на самакіраванне. Залаты леў стаіць на задніх лапах, а пярэднімі сціскае сярэбраную стралу.

## Папрасіць заступніцтва

**4** Для аматараў барока ў Слоніме рай: у гэтым стылі ў 1642 годзе пабудавана адна з найстарэйшых сінагог Беларусі. Беласнежны барочны касцёл Святога апостала Андрэя зачароўвае фігурнымі франтонамі, глыбокімі выцягнутымі нішамі на фасадзе, так характэрнымі для мілага сэрцу беларуса віленскага барока. Над невысокімі забудовамі цэнтра, паміж якімі яшчэ захаваўся сапраўдны брук, узвышаецца праваслаўны Спаса-Праабражэнскі сабор, таксама пабудаваны ў агульнай заходнебеларускай стылістыцы.

Вернікі не толькі з Беларусі, але і з блізкага ды далёкага замежжа масава едуць у Свята-Успенскі Жыровіцкі манастыр. Мясцовы абраз Божай Маці ўваходзіць у сотню самых ушанаваных сусветных праваслаўных святынь. У цудатворнага абраза просяць аб вылячэнні ад хвароб, апецы і заступніцтве шматлікія паломнікі.

## Убачыць “рыцарскую мрою”

**5** За казачны вобраз ды раскошу палац графаў Пуслоўскіх (Косаўскі замак) называлі “рыцарскай мрояй”. Над стварэннем палацава-паркавага ансамбля варажылі варшаўскія ды італьянскія архітэктары. Дванаццаць гранёных веж у гонар кожнага месяца года, фасады ўпрыгожваюць спічастыя аркі. Пра былую раскошу і багацце расказваюць неверагодныя гісторыі. Падлога ў некаторых залах была шкляной, і пад ёю ў вялізных акварыумах плавалі экзатычныя рыбкі. Па калідорах па начах разгульваў сапраўдны леў. Гавораць, што быў і падземны ход “шырынёй у карэту і тройку” і даўжынёй 25 кіламетраў.

Крысціна **Хілько**

**Версіі**

### Адкуль пайшла назва горада?

**■ У летапісах Слонім згадваецца як Услонім, Васлонім, Вслонім. Большасць даследчыкаў лічыць, што назва паходзіць ад усходнеславянскага слова “услона” — заслон, фарпост.**

**■ Магла ўзнікнуць як вытворнае ад слова “слон”. Нібыта ў старажытнасці там знаходзілі слановыя (мамантавыя) косці.**

**■ Ад польскіх слоў “слома” — салома або “сланіна” — сала. У горадзе было шмат саламяных стрэх і шырока гандлявалі салам.**

**■ Ад зліцця двух слоў грэчаскага паходжання “сола” — адзін і “ім” — імя. Што значыць “аднайменны”.**

# Карнавал гасцям да твару



**Вялікі тэатр Беларусі раскрыў свае дзверы і на стары Новы год — у ноч з 13 на 14 студзеня. У той зімовы вечар у тэатры давалі Вялікі калядны баль**

Гэты буйны культурны праект Вялікага тэатра Беларусі ўжо стаў традыцыяй, і многія гараджане нават і не ўяўляюць першы месяц года без грандыёзнага свята, дзе збіраюцца дамы ў раскошных вячэрніх сукенках і пышных спадніцах, а мужчыны — у элегантных касцюмах, смокінгах і фраках. Гэта якраз тая адзіная ноч у годзе, калі дзяўчаты могуць адчуць сябе Папялушкамі ці прынцэсамі, а юнакі — добра выхаванымі кавалерамі. На гэтым балі здараюцца і лёсавызначальныя сустрэчы, у выніку якіх утвараюцца сем'і.

Вялікі баль у Вялікім — гэта шорах сукенак, вясёлы смех, звон бакалаў, забаўныя розыгрышы, цудоўная музыка і самыя розныя танцы — ад вальса да паланэза. Але самае галоўнае — 13 студзеня мы атрымліваем асалоду ад опернага і харэаграфічнага мастацтва выдатных артыстаў і музыкантаў Вялікага, якія і сёлета зрабілі вечар па-сапраўднаму чароўным.

Акурат у 20:00 расчыніліся дзверы тэатра — і госці закружыліся ў водавароце ўсялякіх забаў. Ужо ў фае тэатра нас сустракаў Зоркалік, а таксама героі казак Аляксандра Пушкіна. Кот вучоны запрашаў прыняць удзел у літаратурных спаборніцтвах, а Залатая рыбка — злавіць сваю ўдачу. Залаты пеўнік, вядома ж, павіншаваў з Новым годам.



Фота на ўспамін

У 21:00 — баль грымнуў. Усё вакол зіхацела. Падавалася, нават люстры і люстэркі блішчаць ярчэй, а ў іх знаходзяць адбітак і яркія ўборы, і асляпляльныя ўсмешкі гасцей. Кожны з іх мог выбраць той від творчасці, да якога ляжыць душа. Хто ў літаратурным салоне вершы пaскладаць, хто на "кінастудыі" паспрабаваць свае сілы ў акцёрскім мастацтве ці выяўленчай творчасці. Акрамя таго, можна было атрымаць мілыя шаржы-партрэты. І тыя, хто ўмее з сябе пасмяяцца, так і зрабілі. Можна таксама было навучыцца разумець мову кветак і зрабіць паштоўку-віншаванне сваімі рукамі або напісаць пасланне на сваім целе — з дапамогай тэхнікі мехендзі. А яшчэ даведацца пра свой лёс у астралагічным салоне. І сфатаграфавацца разам з курсантамі, як гэта зрабіла наш дызайнер Надзея Панкратава. Зразумела ж, і патанцаваць ад душы можна было з імі.



А ў 23.00 у вялікай зале тэатра пачаўся канцэрт. Гэта было штосьці феерычнае. Уся сцэна зіхацела, і галасы оперных артыстаў, падавалася, гучалі і вышэй, і глыбей, а балетныя нумары зачароўвалі дасканалай тэхнікай выканаўцаў.

Апоўначы ўсіх гасцей частавалі шампанскім. Баль працягваўся! Танцаваць не пераставалі далёка за поўнач.

Другі год запар заслужаная артыстка Беларусі Юлія Дзятко, пачынаючы з лістапада, вучыць мастацтву танца тых, хто купіў білет на баль у Вялікі тэатр і хоча бліснуць у ноч на 14 студзеня складанымі і цікавымі па.

— Летась страшэнна хвалявалася! Яшчэ б! Гэта ж быў мой першы Навагодні баль у Вялікім! — прызналася журналістам Юлія. — Цяпер ужо ёсць пэўны досвед, таму, спадзяюся, працаваць будзе крыху прасцей.

Усе вучні былі рознымі. Памятаю пары, якім ой як няпроста было кіраваць сваім целам — яно іх проста не слухалася. Але ў выніку яны станцавалі бліскуча і нават заслужылі нейкія прызы. Лішні раз пераконваюся, што галоўнае — гэта жаданне танцаваць. Калі гэты запал ёсць, то і здольнасці праявяцца..

Навагодні баль у Вялікім — гэта прыгожае свята, дзе можна акунуцца ў атмасферу пазамінулых стагоддзяў, больш за тое — не толькі ўбачыць, як жанчыны ў вячэрніх уборах і мужчыны ў фраках танцуюць паланэз або контрданс, польку ці вальс, але і самому апынуцца сярод іх, стаць часткай гэтага цудоўнага дзейства. І назіраць усё гэта было весела.

Міхаліна **Чаркашына**

# Запрашэнне на баль кнігі

**У святочна афармленым фае Вялікага тэатра Францыск Скарына, быццам сышоўшы з вядомай гравюры, задуменна вывучае фаліянт... З'яўленне вялікага палачаніна ля навагодняй ёлкі, упрыгожанай замест цацак тамамі, невыпадковае: штогадовы Калядны дабрачынны баль кнігі не мог абысціся без першадрукара!**

Бо сёлета — паўтысячы гадоў з таго часу, як Скарына выдаў сваю першую кнігу. А мінулы год, Год культуры, завяршаўся выдатным святам — традыцыйным балем кнігі, часткай рэспубліканскай акцыі "Нашы дзеці". На аўкцыён выстаўляліся лепшыя ўзоры нацыянальнага кнігавыдання, выручаныя грошы пайшлі на дабрачыннасць.

Міністр інфармацыі Лілія Ананіч падкрэслівала, што баль кнігі — своеасаблівая калядная справаздача перад чытачамі і заяўка аб планах на будучыню.

— Прэзідэнт у Год кнігі сказаў пра тое, што калі мы страцім кнігу, то страцім краіну. Гэта лейтматыў усяго кнігавыдання Беларусі. Мы не страцілі кнігу і сёння пачынаем адзначаць знакавую дату — 500-годдзе беларускага кнігадрукавання.

Ганарыцца нашым выдаўцам ёсць чым. Міністр прывяла такія лічбы: штогод у краіне выдаецца больш за 10 тысяч найменняў кніг, а гэта звыш 2,3 кнігі на кожнага грамадзяніна. Сярод лотаў сёлета — шасцітомная энцыклапедыя "Культура Беларусі", "Беларусь алімпійская" з аўтографамі вядомых спартсменаў, "Гонар Беларусі. Маладыя, таленавітыя, адораныя" з роспісамі салістаў Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі. Гэты аўкцыён стаў міжнародным: Асацыяцыя выдаўцоў, паліграфістаў і кнігараспаўсюджвальнікаў Казахстана прапанавала раман-трылогію Ільяса Есенберліна "Качэўнікі", Федэральнае агенцтва па друку і масавых камунікацыях Расіі — "Падарожжа наследніка Цэсарэвіча" ў трох тамах. Гэты трохтомнік, дарэчы, аказаўся адным з самых дарагіх лотаў: са стартавай цаны ў нуль рублёў дайшлі да тысячы. А самае запатрабаванае выданне — "Беларусь алімпійская" — пайшло з малатка за 1,5 тысячы рублёў. Усяго ж на балі сабрана 8,6 тысячы рублёў, якія прызначаны выхаванцам Шклоўскай дзяржаўнай спецыяльнай агульнаадукацыйнай школы-інтэрната для дзяцей з парушэннем зроку.

— Было адчуванне сапраўднага навагодняга свята, чараўніцтва, — выказваў свае эмоцыі дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура" Алесь Бадак. — Што выстаўлялі мы? Выданне паэмы Якуба Коласа "Новая зямля", для якога народны мастак Васіль Шаранговіч намаляваў сорак ілюстрацый, стала з нашых лотаў самым дарагім — каля тысячы рублёў. Кніжка, выпушчаная да юбілею Максіма Багдановіча "Я не самотны...", з'явілася нядаўна, аднак вельмі хутка раскупляецца, так што яе таксама можна назваць рарытэтам.

Людміла **Іванова**

Мінскі балетмайстар Валянцін Елізар´еў:

# У Маі Плісецкай — беларускія карані



**Яна марыла адзначыць юбілей з бляскам, хацела выйсці на сцэну любімага Вялікага тэатра, каб убачыць тых, каму ўсе гэтыя гады дарыла свой талент. Сама прыдумала праграму гала-канцэрта. Канцэрт "AVE MАЯ" адбыўся, але, на жаль, без яе... Як крылом матылька, яна закранула жыцці многіх. Вядомы беларускі харэограф Валянцін Елізар'еў працаваў з балерынай на здымках фільма Анатоля Эфраса "Фантазія" па матывах аповесці Тургенева "Веснавыя воды". Было гэта ў далёкім 1976 годзе. З тых часоў Елізар'еў і Плісецкая сустракаліся не аднойчы, іх звязвала сапраўднае творчае сяброўства.**

## Рухі Адама падгледзеў у сына

***— Разам з Эфрасам, Плісецкай і Смактуноўскім у 1976 годзе вы ўдзельнічалі ў здымках фільма "Фантазія". Як было працаваць побач з такімі асобамі?***

— Многаму навучыўся. Літаратурны матэрыял, які ўзяты за аснову фільма — аповесць Тургенева "Веснавыя воды". Але як разумна назваў Эфрас пастаноўку! У фантазіі ўсё магчыма. Гэта быў эксперымент — спроба злучыць балет і драму.

Так супала, што якраз падчас здымак фільма ў нас з жонкай нарадзілася дачка. З творчай паездкі ў Італію Мая Міхайлаўна прывезла ў падарунак пакет цацак і дзіцячага адзення. Такія дэталі не забываюцца.

Яшчэ са студэнцтва знаёмы з Радзівонам Шчадрыным. Думаю, гэта ён параіў Эфрасу запрасіць мяне. За год да гэтага я паставіў спектакль "Кармэн-сюіта" для Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета, над музычнай рэдакцыяй якога працаваў Шчадрын. Упэўнены, ён такі ж класік XX стагоддзя, як Стравінскі, але пакуль недаацэнены. Яго музыка складаная. І таму не такая папулярная, як таго заслугоўвае. Каб выканаць яе, тэхніка павінна быць бліскучай. Куды прасцей сыграць вальс Штрауса. І публіка задаволена.

### Дасье

**Валянцін Елізар'еў нарадзіўся ў 1947 годзе. З 1973 года працаваў галоўным балетмайстрам Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларускай ССР. З 1992 па 1996 год — мастацкі кіраўнік балетнай трупы Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. З 1996 па 2009 год — дырэктар, мастацкі кіраўнік Тэатра балета Рэспублікі Беларусь.**

**Народны артыст СССР і БССР, лаўрэат Дзяржпрэміі Рэспублікі Беларусь, прэміі "Бенуа дэ ля данс" Міжнароднай асацыяцыі дзеячаў танца і многіх іншых. Ганаровы грамадзянін Мінска. Прафесар Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі (БДАМ).**

**Самыя вядомыя пастаноўкі: "Кармэн-сюіта" (1974), "Стварэнне свету" (1976), "Тыль Уленшпігель" (1978), "Спартак" (1980), "Шчаўкунок" (1982), "Балеро" (1984), "Рамэа і Джульета" (1988), "Дон Кіхот" (1989), "Страсці" ("Рагнеда") (1995), "Спячая прыгажуня" (2001).**

## Не любіла паўтараць

Апошні раз харэограф і балерына сустрэліся на конкурсе ў Японіі.

— Сустрэча гэтая была вельмі сардэчнай, — успамінае Елізар’еў. — Да гэтага мы некалькі гадоў не бачыліся. Мая Міхайлаўна жыла ў Мюнхене. Падчас нашых сустрэч было адчуванне нейкага цёплага сяброўства і даверу адно да аднаго. У яе было вельмі выбранае кола зносінаў, але я ў яго ўваходзіў.

***— Напэўна на тым конкурсе былі эксперыментальныя работы? Мая Міхайлаўна наогул прымала пошук у танцы?***

— Яна ж адной з першых стала працаваць з Морысам Бежарам, Джэромам Робінсам. Разумела і прымала эксперымент! І тым, з кім працавала, давярала цалкам. Яна, дарэчы, любіла паўтараць фразу, што з любым харэографам працуе толькі адзін раз. Гэтага правіла і прытрымлівалася ўсё жыццё.

Я шмат меў зносінаў не толькі з ёю, але і з яе мужам, кампазітарам Радзівонам Шчадрыным, ставіў балеты на яго музыку. Бачыў, наколькі Мая Міхайлаўна адданая Шчадрыну як чалавеку і творцу. Дзіўна было назіраць іх зносіны, яны абагаўлялі адно аднаго. Мне пашчасціла гэта бачыць.

***— Якой Плісецкая была ў рабоце?***

— Вядома, яна ведала сабе цану, але са мной была адкрытай. Мы супрацоўнічалі вельмі сур’ёзна і плённа. Вельмі рэдка бывае, калі ў творчым працэсе рух ідзе з двух бакоў насустрач адзін аднаму. Звычайна нейкае супраціўленне ўсё-такі ўзнікае. Яна ўмела дабівацца пастаўленых мэт, умела чуць, пераплаўляць у танцы ўсё ўбачанае і пачутае.

Нямногія памятаюць, што ў Маі Міхайлаўны былі два родныя браты, Аляксандр і Азарый, якія таксама звязалі свой лёс з балетам. Я быў знаёмы з Азарыем. Ён доўгі час працаваў на Кубе, потым у трупе Марыса Бежара. Родны дзядзька Плісецкай Асаф Месерэр тройчы ставіў у Вялікім тэатры оперы і балета класічны балет “Лебядзінае возера”.

Плісецкія-Месерэры — гэта наогул вельмі сур’ёзная дынастыя, якая ўзбагаціла нашу культуру. У Маі — беларускія карані. Маці Плісецкай родам з Вільні, бацька — з Гомеля.




Адна з самых яркіх прац — галоўная партыя ў балеце Сяргея Пракоф´ева “Рамэа і Джульета”

***— Лёс яе бацькоў трагічны. Як ёй удалося не азлобіцца на жыццё?***

— Мы гэтую тэму ў гутарках не закраналі. Гаварылі толькі пра творчасць.

***— Як вам падаецца, сёння ў балеце ёсць велічыні, роўныя ёй?***

— У мастацтве цяжка параўноўваць, усе велічыні розныя. Плісецкая — гэта асобная вялікая творчая індывідуальнасць.

## Між тым

***— Адна з самых вядомых вашых пастановак — балет “Стварэнне свету” 1976 года. Чым ён запомніўся?***

— Калі прыдумваў партыю Адама, многія рухі ўзяў ад сына. Назіраў, як ён поўзае, ходзіць яшчэ няўпэўнена — ён жа зусім маленькі тады быў. Гэтая пластыка была патрэбна мне для пастаноўкі.

Даўно “Стварэнне” не пераглядаў. Але, калі апошні раз бачыў, засталося адчуванне, што са спектакля жыццё сыходзіць, адна толькі форма засталася. Ёсць такая заканамернасць: калі спектакль не пракатваецца раз у два месяцы, то ён павольна разбураецца. Мае пастаноўкі ў бягучы рэпертуар ставяць рэдка, яны ідуць у скарочаных складах. Адносіны да іх як да пасынкаў.

Валянцін **Пепяляеў**

**Дарэчы**

### Адкуль з’явілася “Фантазія”?

**Фільм-балет “Фантазія” зняты рэжысёрам Анатолем Эфрасам у 1976 годзе па матывах аповесці “Веснавыя воды” Івана Тургенева. З кнігі ўзята невялікая частка — успаміны Саніна аб сустрэчы з Полазавай. Мая Плісецкая сама працавала над сцэнарыем, сыграла галоўную ролю. У фільме гучаць фрагменты музыкі Пятра Ільіча Чайкоўскага. Балетмайстар — Валянцін Елізар’еў. У ролях: Мая Плісецкая (Марына Мікалаеўна Полазава), Інакенцій Смактуноўскі (Дзмітрый Санін), Анатоль Бердышаў (Санін, балетная партыя), Андрэй Папоў (Іпаліт Полазаў), Таццяна Ведзянеева (Джэма).**




Пераможца конкурсу XXIX Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі — саліст Цэнтральнага ансамбля песні і танца арміі Кітая Юйчэн Яа

# Каб умець танчыць, трэба больш чытаць

## Гран-пры конкурсу XXIX Міжнароднага фестывалю сучаснай харэаграфіі ў Віцебску прысуджаны салісту Цэнтральнага ансамбля песні і танца арміі Кітая Юйчэну Яа

Мініяцюру "Мае мерыдыяны" паставіў для яго харэограф Чжан Цян, які дзесяць гадоў назад выйграў IFMC. За восем з паловай хвілін кітайскі артыст расказаў вельмі зразумелую гісторыю: аглядаючыся на пройдзеныя мерыдыяны свайго жыцця, кожны з нас думае, што можна было зрабіць усё прасцей, без лішніх пакут і гора. Аднак гэта плата за тое, каб навучыцца жыць як трэба.

У адрозненне ад многіх іншых конкурсных пастановак у "Мерыдыянах" задума харэографа была ўвасоблена ідэальна: на ідэю працавалі музыка, святло і кожны рух. Астатнім гармоніі не хапіла. Менавіта таму старшыня журы, прафесар Пекінскай акадэміі танца Сяа Сухуа, каменціруючы адбор фіналістаў, сказаў:

— У фінал выйшлі работы, якія больш ці менш таго годныя. Тэхніка танцораў і танца стала намнога вышэйшая, чым шэсць гадоў назад, калі я быў у Віцебску. Але ў творах мала сэнсу і глыбінных ідэй.

Больш за ўсё Сяа Сухуа спадабалася — а члены журы, акрамя судзейскіх балаў, пакінулі карткі, дзе вылучылі лепшы з іх пункту гледжання нумар — работа After before сумеснага праекта кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Мацея Кузьмінскага. За




Сцэны з прэм'ерных спектакляў Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі "Шэсць танцаў" і "Маленькая смерць"

актуальную гісторыю пра жыццё бежанцаў нашы студэнты атрымалі першую прэмію ў памеры 3.000 долараў. Другое месца журы падзяліла на дзве часткі — па 1.000 долараў атрымалі пастаноўкі Second floor Кацярыны і Анатоля Вадзянскіх і "Чатыры вобразы граху" калектыву "Табіле мадэрн балет", абодва лаўрэаты з Кіева. Трэцяя прэмія паехала ў Талін.

Упершыню за шмат гадоў экспертны савет фестывалю не ўручыў прэмію імя Яўгена Панфілава: яна прысуджаецца лепшаму харэографу, але ні адна з 32 пастановак не падалася крытыкам годнай. Прызавы фонд падзялілі на некалькі спецпрэмій, якія дасталіся калектывам з Віцебска, Омска і Чэлябінска. Узнагароды "Прызнанне калег" удастоена работа "Соль" Анастасіі Харчанкі і Пятра Наку з Кіева — прыз уручаўся ўпершыню на аснове галасавання канкурсантаў.

Як заўсёды, на фестывалі дыскутавалі пра тэндэнцыі contemporary dance. І калі яшчэ ўчора эксперты і публіка захапляліся арыгінальнасцю гэтага напрамку, то сёння прафесіяналы гавораць харэографам: трэба адыходзіць ад аднолькавасці. Узровень канкурсантаў аказаўся як ніколі раней аднолькавым. На думку старшыні экспертнага савета Ларысы Барыкінай, абышлося практычна без правалаў, але не было і ўзрушэнняў, узлётаў, адкрыццяў:

— Гэта гаворыць пра адно: усе навучыліся базавым рэчам і паняццям, усе добра рухаюцца. У Віцебску гадоў 15 назад мы не назіралі такой масы добра навучаных людзей. Цяпер засталося, авалодаўшы "азбукай" цела, навучыцца гаварыць. Бо ў сучасным танцы кожны можа назваць сябе харэографам, такога няма ні ў адным відзе танцавальнага мастацтва. У выніку індывідуальнасці на сцэне не стала, прагрэсіруюць некампетэнтнасць і непрафесіяналізм. А пачалося ўсё з крайняга адлюстравання талерантнасці, калі слова даюць усім. Кожны чалавек — яркая ўнікальная асоба і мае права выказацца, гэта бясспрэчна. Але хочацца спытаць: "А вам ёсць што сказаць, каб зала ў тысячу чалавек услухоўвалася?" І другі момант — з сучаснага танца сыходзіць эмоцыя. Цяпер сорамна быць эмацыйным, сорамна адпавядаць добрай музыцы, трэба быць высокаінтэлектуальным і гаварыць пра нейкія глабальныя пакуты і пакутлівыя пошукі. Шкада толькі, знаходак няма.

Хто б мог падумаць, што праз гады свабоды галоўнай праблемай пастановак на IFMC назавуць... прадказальнасць! Загадчыца кафедры харэаграфіі БДУКМ прафесар Святлана Гуткоўская не хавала: праз пяць секунд пасля пачатку нумара эксперты глядзелі ў праграмку, каб даведацца, колькі гэта будуць паказваць. Такіх нумароў было шмат, паўторы здараліся нават у светлавых вырашэннях. Што ж, гавораць, гісторыя харэаграфіі развіваецца па спіралі. На першым этапе ідзе напрацоўка тэм, хоць выразных сродкаў бракуе, потым прыходзіць тэхніка і пачынаюцца паўторы ў рухах, узнімаюцца падобныя тэмы і праблемы. У выніку мы бачым на сцэне добра падрыхтаваных хлопцаў і дзяўчат, якія спрабуюць удыхнуць нейкія ідэі ў бяззмястоўны нумар.

Вядомы харэограф Раду Паклітару абазначыў тэндэнцыі:

— Маладыя аўтары звяртаюцца да глабальных тэм, замест таго каб гаварыць пра штосьці канкрэтнае. У мяне першакурснікі таксама любяць ставіць пра зорнае неба, інь і ян, боскі пачатак, анёлаў і дэманаў... Уся зямная філасофія для іх матэрыял для творчасці. Гэта агульная хвароба. Хоць любую філасофскую тэму значна лягчэй раскрыць, расказваючы пра аднаго чалавека ці пра ўзаемаадносіны ў пары.

Што ж, хочацца верыць, што ўдзельнікі будучых конкурсаў прыслухаюцца да парад экспертаў і пачнуць больш чытаць. Так-так, гэта раней ім раілі больш рэпеціраваць. Цяпер рэкамендацыі іншыя: часцей адкрываць добрую літаратуру і знаёміцца з сур'ёзнымі тэкстамі, калі ўжо прэтэндуеце на экзістэнцыйныя пошукі. А мы, удзячная публіка, пастараемся вас зразумець.

Наступны фестываль у Віцебску стане юбілейным, 30-м. Пажадаем яму адкрыццяў.

Вольга **Кручанкова**



ПАВЕЛ ЧУЙКО

# Арт-падарожжа з Лісабона да Уладзівастока пачалося ў... сталіцы Беларусі

## Унікальны праект, які сабраў працы 30 мастакоў з 28 еўрапейскіх краін, стартаваў у мінскай галерэі

Аўтары гэтай ідэі — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Францыі Павел Латушка і беларускі мастак Віктар Альшэўскі. Ад яе нараджэння да ўвасаблення прайшло менш за год. Вялікую ролю ў арганізацыі ўнікальнай, без перабольшання, выставы адыграла суладная работа дыпламатычных прадстаўніцтваў Беларусі ў еўрапейскіх краінах і Міністэрства замежных спраў. Дарэчы, сам праект рэалізоўваўся пад афіцыйным патранатам ЮНЕСКА. Гэта лішні раз падкрэслівае яго міжнароднае гуманітарнае значэнне. А ўнікальнасць выставы ў тым, што ўпершыню Мінск выступіў цэнтрам яднання прадстаўнікоў сучаснага мастацтва еўрапейскіх краін.

Справа ў тым, што еўрапейская культура сёння выступае як гуманітарная процівага палітычным і сацыяльным канфліктам, абапіраючыся на свае шматвяковыя традыцыі і ў той жа час звяртаючыся да гледача праз самыя сучасныя формы жывапісу і скульптуры. Мінск, які стаў у апошнія гады адной з самых актыўных перагаворных пляцовак па ўрэгуляванні міжнародных канфліктаў у еўрапейскім рэгіёне, цяпер прымярае на сябе і ролю цэнтра культурнай дыпламатыі.

***Беларусь — краіна, якая знаходзіцца на скрыжаванні дарог, што злучаюць Еўропу і Азію, краіна, якая заўсёды імкнулася садзейнічаць міру і добрасуседству ў нашым рэгіёне. Мы выступаем за развіццё добразычлівых адносінаў з іншымі краінамі свету незалежна ад іх геаграфічнага месцазнаходжання і даўжыні межаў, з павагай ставімся да нашых партнёраў і разлічваем на адпаведныя адносіны да Беларусі з іх боку. Цяперашняя выстава — гэта ўклад беларускай дыпламатыі ў разнастайную палітру культурных падзей, што адбываюцца ў нашай краіне***

“Беларусь — краіна, якая знаходзіцца на скрыжаванні дарог, што злучаюць Еўропу і Азію, краіна, якая заўсёды імкнулася садзейнічаць міру і добрасуседству ў нашым рэгіёне. Мы выступаем за развіццё добразычлівых адносінаў з іншымі краінамі свету незалежна ад іх геаграфічнага месцазнаходжання і даўжыні межаў, з павагай ставімся да нашых партнёраў і разлічваем на адпаведныя адносіны да Беларусі з іх боку. Цяперашняя выстава — гэта ўклад беларускай дыпламатыі ў разнастайную палітру культурных падзей, што адбываюцца ў нашай краіне”, — адзначаў на ўрачыстым адкрыцці выставы ў Мінску старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, Міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь Уладзімір Макей.

Выстава ўсё яшчэ праходзіць у сімвалічным месцы Мінска — побач са старажытным Верхнім горадам, дзе, у тым ліку, у навагоднія і калядныя святы звычайна збіраецца вялікая колькасць турыстаў. Можна не сумнявацца, што галерэя імя народнага мастака Міхаіла Савіцкага, у якой размясцілася экспазіцыя, стала цэнтрам прыцягнення не толькі для мінчан, якія цікавяцца сучасным мастацтвам, але і для гасцей з розных краін.

Галерэя Міхаіла Савіцкага ўваходзіць у комплекс Музея гісторыі горада Мінска — унікальнага праекта мінскіх гарадскіх улад, які аб’ядноўвае шэраг будынкаў і будынкаў-артэфактаў гісторыі беларускай сталіцы, у тым ліку і нядаўна рэканструяваныя ўчасткі Верхняга горада, так хутка ўпадабаныя мінчанамі і гасцямі горада.

А мастакі, якія прадстаўляюць свае працы на выставе “Ад Лісабона праз Мінск да Уладзівастока” — гэта як прызнаныя і дасведчаныя мэтры выяўленчага мастацтва, так і маладыя, але ўжо вядомыя ў сваіх краінах майстры. Іх творчасць раз-



Ля прац беларускага мастака Віктара Альшэўскага



ПАВЕЛ ЧУЙКО

Удзельнікі выставы былі папулярныя ў фотажурналістаў

настайная, аднак экспазіцыя выставы пабудаваная такім чынам, што гэтая разнастайнасць успрымаецца як адзінае цэлае, як сімвал самабытнасці еўрапейскіх краін, якія тым не менш маюць агульную культурную прастору.

Бялградскі саміт — такім вы яго яшчэ не бачылі. Сербскі мастак Радаван Трнавац Міч зразумеў паседжанне літаральна і перанёс дзяржаўную сімволіку краін-удзельніц на крэслы. Атрымаўся такі своеасаблівы і арыгінальны арт-аб'ект. А ўкраінскі мастак Руслан Кутняк піша грашыма. Напрыклад, партрэт каралевы-маці выразаны з брытанскіх фунтаў. Калаж распазнавальны, аўтар пакінуў прозвішча.

Сталіцу Партугаліі — Лісабон — асабіста прадстаўляе мастак Луіс Радрыгес на партугальскі манер. Мастак-сімваліст у Беларусі ўпершыню.

Луіс Радрыгес (Партугалія): "Для мяне вельмі важна не проста выказвацца на палатне, але і мець зносіны са сваім гледачом, бачыць рэакцыю на тое, што я раблю. Таму, калі паступіла запрашэнне прыехаць у Мінск, я ні хвіліны не сумняваўся. Гэта магчымасць даведацца пра беларускую публіку".

17 750 км ад Лісабона да Уладзівастока. На такой адлегласці знаходзяцца геаграфічныя акцэнты на еўрапейскай карце. Дарэчы, той факт, што ў Мінску сыходзяцца мастацкія шляхі, падкрэсліваюць і такія абазначэнні. Кіламетраж ад сталіцы да сталіцы вызначаецца тут.

Луіс Радрыгес:

***Для мяне вельмі важна не проста выказвацца на палатне, але і мець зносіны са сваім гледачом, бачыць рэакцыю на тое, што я раблю. Таму, калі паступіла запрашэнне прыехаць у Мінск, я ні хвіліны не сумняваўся. Гэта магчымасць даведацца пра беларускую публіку***

Палотны для экспазіцыі прайшлі праз творчае сіта куратара Віктара Альшэўскага. Гэта ён падбіраў працы для дэбюту беларусаў у Францыі на парыжскім салоне "Арт-капіталь". Ён жа і адзіны ўдзельнік цяперашняга вернісажу ад нашай краіны.

Вернісаж нагадвае дыпламатычны раўт. Дарэчы, гэтая выстава — фінальны колер у палітры мінулага Года культуры. І ўжо ўстанавіла рэкорд. 11 месяцаў — менавіта такі тэрмін спатрэбіўся, каб наладзіць кантакты з мастакамі еўрапейскай дыяспары. Усе пасольствы ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы праекта.

Цэрэтэлі, Фукс, Гамільтан — мастакі першага шэрага, прызнаныя ў свеце. Запрашэнне ў Мінск атрымалі не толькі патрыярхі мастацкай думкі, але і маладыя аўтары. Мінская арт-пляцоўка зноў сябе апраўдала як цэнтр культурных камунікацый. Дарэчы, святочная ёлка рэзюмавала асноўны канцэпт праекта — Еўропа без раздзяляльных ліній, краіны як суседзі на галінах дрэва.

"Маштаб арт-праекта — гэта даследаванне, інтэлектуальнае падарожжа і стварэнне новай інфармацыйнай прасторы праз сталіцы свету. Гэта імкненне ўбачыць, супаставіць і асэнсаваць саму з'яву духоўнай культуры


ПАВЕЛ ЧУЙКО

Віктар Альшэўскі, Павел Латушка і Уладзімір Макей

таго, каб Еўропа стала агульным і ўтульным домам, у якім пануюць мір, спакой, прыгажосць і ўпэўненасць у будучыні, — сфармуляваў сутнасць старшыня Нацыянальнай камісіі па справах ЮНЕСКА, Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей, адкрываючы выставу.

Як ні дзіўна, тут гэта ёсць — і прыгажосць, і спакой, і ўпэўненасць. Нягледзячы на гарачы чырвоны на палотнах Зураба Цэрэтэлі (якія, хутчэй за ўсё, у многіх стануць першым уражаннем выставы). І на кантрасны чорны ў карцінах Ірыны Шувалаф з Хельсінкі. На іранічныя рэфлексіі таго ж Руслана Кутняка ад Украіны, палітычную сатыру Радавана Трнавац Міча з Сербіі і поп-арт Крысціяна Банавія з Манака з, падавалася б, далёкім ад любых катаклізмаў аблічам прынцэсы Грэйс... Для адных жывапіс — трыбуна, для другіх — вежа са слановай косці. На выставе “Ад Лісабона праз Мінск да Уладзівастока” — як у жыцці, ёсць усё. Але ці то перамагае сонечная цеплыня жоўтага колеру, які ў агульнай палітры відавочна дамінуе, ці то эмацыйныя выказванні аўтараў палотнаў такія даверальныя, тут ствараецца адчуванне, што ісціна недзе побач. І гэтая ісціна абнадзейвае.

Еўрапейская культура ў цяперашняй сітуацыі выступае як гуманітарная процівага палітычным і сацыяльным канфліктам, абапіраючыся на свае шматвяковыя традыцыі і ў той жа час звяртаючыся да гледача і кожнай сталіцы, кожнай дзяржавы, кожнага аўтарскага праекта. Гэта жаданне спасцігнуць адзінства нашага духу”, — так каменціруе канцэпцыю выставы яе куратар і ўдзельнік ад Беларусі, мастак Віктар Альшэўскі.

Зрэшты, асноўная канцэпцыя арт-праекта — адсутнасць усялякіх канцэпцый, без якіх цяпер не праходзіць, напэўна, ні адна выстава. Віктар Альшэўскі настойліва падкрэслівае гэты факт, адзначаючы, што мастакі самі вызначылі, якія працы перадаць у мінскую галерэю. Хто менавіта прадставіць краіны на такой выставе, таксама вырашалася не ў Мінску. Аднак разнастайнасць аўтарскіх стыляў у прасторы галерэі нечакана выбудавалася ў нешта вельмі сугучнае і гарманічнае. Дарэчы, некаторыя мастакі вырашылі прыехаць на адкрыццё выставы асабіста, што толькі падкрэслівае іх цікавасць да Беларусі як краіны і як цэнтра культурнай супольнасці.

Берлінскі мастак Ульрых Уфрэхт паказвае свае любімыя палотны, адабраныя для паказу ў Мінску, і расказвае пра бежанцаў з Сірыі і Афганістана, якіх яны з жонкай вырашылі прытуліць. Пасля чаго паведамляе, што палітру для сваіх карцін падбірае так, каб фарбы маглі прыўнесці нешта пазітыўнае ў жыццё людзей, пацярпелых ад праблем. У яго дзіўныя абстракцыі — цёплыя і вельмі дакладныя. Як высвятляецца, адчуванні гледачоў вуліцы, залітай дажджом, або ўтульнага святла вячэрніх вокнаў выразна супадаюць з намерам аўтара гэтых прац адлюстраваць менавіта дождж і вокны, дакладней, свае эмоцыі ад гарадскіх краявідаў, якія на справе могуць аказацца бліжэйшымі і цяплейшымі за многія іншыя.

— Гэтая падзея — яркае сведчанне, што мы можам многае зрабіць для



Уражанні не толькі ад карцін



Выстава пацвердзіла, што Зураб Цэрэтэлі не толькі вялікі скульптар

праз самыя сучасныя формы жывапісу і скульптуры. Мінск, які стаў у апошнія гады адной з самых актыўных перагаворных пляцовак па ўрэгуляванні міжнародных канфліктаў у еўрапейскім рэгіёне, прымае на сябе сёння і ролю цэнтра культурнай дыпламатыі.

“Мастацтва — сфера чалавечага жыцця, якая дае нам унікальную магчымасць разумення гісторыі і сучаснасці розных народаў і дзяржаў. Яно дазваляе нам спазнаць адначасова як нашу разнастайнасць, так і нашу супольнасць у вялікім свеце. Сімвалічна, што менавіта Мінск сёння становіцца цэнтрам аб’яднання і пабудовы агульнай культурнай прасторы, якая зближае краіны і народы”, — заявіў старшыня Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта Андрэй Шорац.

У выставе ж прымаюць удзел мастакі, якія жывуць у еўрапейскіх сталіцах, таксама ва Уладзівастоку — самым усходнім горадзе Еўразійскага кантынента, і ў Санкт-Пецярбурзе — прызнанай культурнай сталіцы Расіі. Так, у адной выставачнай зале ўдзельнікі гэтага праекта ніколі раней яшчэ не сустракаліся. Аднак некаторыя аказаліся даўно знаёмыя і былі рады ўбачыцца зноў — не ў Венецыі і на іншых вялікіх еўрапейскіх арт-пляцоўках, а ў Мінску. Падставы для сустрэчы ў іх напэўна яшчэ будуць. У тым ліку і на будучых вернісажах.

Ад ідэі ўвасобіць у адной выставачнай зале мару палітыкаў пра агульнаеўрапейскі дом да яе ажыццяўлення ў Мінску прайшло менш за год. Творцы, дыпламаты і фінансісты нечакана хутка знайшлі агульную мову, хоць колькасць удзельнікаў такога амбіцыйнага арт-праекта стала для ўсіх вялікім сюрпрызам. Нездарма толькі ў ноч напярэдадні вернісажу дыпламатычнай поштай даставілі карціны з Андоры і Манака. Тады ж уначы дадрукоўваліся дадатковыя лісты для выставачнага каталога. А ў Мінск ужо з’язджаліся мастакі. З Партугаліі, Літвы, Бельгіі, Германіі, Італіі, Фінляндыі ды іншых краін, каб асабіста прадставіць свае працы першым гасцям выставы…

Выстава “Ад Лісабона праз Мінск да Уладзівастока” прадоўжыцца амаль да канца зімы. І адправіцца далей — спачатку ў… Лісабон, а затым правандруе па іншых сталіцах у Еўропе.

Веніямін **Міхееў**



ПАВЕЛ ЧУЙКО

Ульрых Уфрэхт: хто як не аўтар растлумачыць сутнасць карцін



Віктар Альшэўскі. Музей свету. Прада. Мужчына — артэфакт.
2016. Палатно, алей. 190x150 см